Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 лютага 2014 г. СЕРАДА № 26 (27636) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Е Т А



Фота БЕЛТА.

# ЗАЛАТАЯ НАША ДАША!

## ЛІК УЗНАГАРОДАМ БЕЛАРУСКАЙ ЗБОРНАЙ АДКРЫТЫ

**Вось і дачакаліся! Біятланістка Дар'я Домрачава ўпершыню ў сваёй кар'еры заваявала алімпійскі залаты медаль. Доўгія гады ўпартых трэніровак, пераможных поклічаў, непрыемных заўваг крытыканаў, гонак, якія ад стомы завяршала лежачы на снезе... Яна мужна прайшла праз усё гэта, каб учора, пад штучным сочынскім асвятленнем, назаўжды ўпісаць сваё прозвішча ў алімпійскую гісторыю. Як аказалася, спрынт, які Даша завяршыла на 9-м радку, быў толькі запеўкай. Сапраўдную феерыю Домрачава прытрымала на гонку праследавання. Яна літаральна не пакінула шанцаў апанентам, зрабіла адзін промах і далёка адарвалася ад сваёй непрымірымай саперніцы з Нарвегіі Туры Бергер. Яе нельга было спыніць. У гэты дзень ёй наканавана было стаць першай. З бліскучай перамогай, Дар'я!**

Анатоль ТОЗІК:

## «ТРЭБА АПЕРАТЫЎНА ВЫРАШАЦЬ ПЫТАННЕ З ЗАРОБКАМІ ПЕДАГОГАЎ»

**Рух у бок павышэння якасці адукацыі праз эфектыўнае выкарыстанне ўсіх рэсурсаў (кадравых, фінансавых і матэрыяльных) віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль Тозік назваў галоўнай задачай на 2014 год.**

— Я цалкам прымаю крытыку на адрас урада. Трэба максімальна аператыўна вырашыць пытанне з заработнай платай усіх, хто сёння працуе ў сферы адукацыі: у дзіцячых садках, школах, вышэйшых навучальных установах,— заявіў на калегіі, дзе падводзіліся вынікі работы адукацыйнай галіны за 2013 год, Анатоль Тозік.— Калі б мы аб'ядналі свае намаганні, то на працягу двух гадоў маглі б выйсці на пэўныя паказчыкі. Было б добра, калі б сярэдні заробак настаўніка, без уліку каэфіцыента сумяшчальніцтва, быў роўны сярэдняму заробку па краіне. А сярэдні заробак прафесарска-выкладчыцкага складу перавышаў сярэдні заробак па краіне ў 1,5 раза. Што мы можам гарантаваць, дык гэта ўтрыманне фінансавання сферы адукацыі на ўзроўні 6% ад валавага ўнутранага прадукту. Сёлета ў бюджэце прадугледжаны намінальны рост заработнай платы па ўсёй бюджэтнай сферы на ўзроўні 14–16 працэнтаў. А вось астатнія рэсурсы давайце будзем шукаць унутры сістэмы адукацыі.

Днямі мы прынялі Пастанову Савета Міністраў аб мерах па ўдасканаленні аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. Гэтым дакументам мы даём права ўсім бюджэтным арганізацыям на манеўры паміж асобнымі артыкуламі выдаткаў, за выключэннем капітальных і камунальных. Усе сродкі, сэканомленыя па іншых артыкулах, вы зможаце накіраваць на любыя патрэбы, у першую чаргу — на заработную плату сваім работнікам, калі палічыце гэта мэтазгодным.

Мы зафіксавалі ў Законе «Аб бюджэце на 2014 год» абсалютную мінімальную суму для кожнай вобласці. І я лічу, што было б правільна, каб кіраўніцтва аблвыканкамаў на месцах зафіксавала такую ж незніжальную суму для кожнага раёна з улікам іх спецыфікі. Было б эфектыўна і правільна, каб і кожны раён, у сваю чаргу, зафіксаваў такую ж незніжальную суму для кожнай установы адукацыі. **Каб дырэктар школы ведаў: вось мой бюджэт, і яго ніхто ў мяне не адбярэ на працягу года. А тымі сродкамі, што я сэканоміў, я магу распарадзіцца ў сваім калектыве.** Мяркую, што ўсё гэта вельмі дапаможа нам прыйсці да здаровага сэнсу.

Анатоль Тозік канстатаваў, што самыя вялікія праблемы сёння з заработнай платай выхавальнікаў і памочнікаў выхавальнікаў у дзіцячых садках:

— Утрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе абыходзіцца бюджэту прыкладна ў 1,5 мільёна рублёў штомесяц. Бацькоўская плата за дзіцячы садок пакрывае толькі 60% ад кошту харчавання. Мяркую, што бацькі зразумелі б нас, калі б мы папрасілі іх аплачваць 100 працэнтаў ад кошту харчавання, а ўсе атрыманыя грошы накіравалі на заработную плату выхавальнікам і памочнікам выхавальнікаў…

І яшчэ адно пытанне ў сувязі з гэтым: магчыма, трэба прапанаваць бацькам аплачваць харчаванне ўласных дзяцей і ў пачатковай школе? І таксама накіраваць атрыманыя сродкі на заробкі педагогам… Неяк нелагічна ў нас атрымліваецца: у дзіцячым садку бацькі плацяць за харчаванне сваіх дзяцей, а ў пачатковай школе гэта робіцца за кошт сродкаў бюджэту. Магчыма, сельскія школы мы пакуль не закранём, а вось у гарадскіх школах можна было б гэта зрабіць…

Па словах віцэ-прэм'ера, 2013 год быў адметны тым, што ўпершыню за 20 гадоў насельніцтва Беларусі не скарацілася, а прырасло. Няхай пакуль за кошт міграцыі (плюс 4 тысячы чалавек), але да нас едуць людзі ў працаздольным узросце, з дзецьмі. Да таго ж, пачынаючы з чэрвеня мінулага года, пачаўся працэс натуральнага прыросту насельніцтва, калі на свет нараджаецца больш людзей, чым памірае. І калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, то ў хуткім часе ўзрасце патрэба ў дзіцячых садках.

— Але мы і сёння не паспяваем задавальняць патрэбы маладых сем'яў у дашкольных установах.

СТАР. 2

■ Жыллё

## КВАТЭРАМ ЗАГАДАЛІ ТАННЕЦЬ

### Да лета кошт мінскай жыллёвай нерухомасці паменшае яшчэ мінімум на 10%

**Практычна штогод у першы месяц новага сезона ўдзельнікі другаснага рынку жылля галоўнага мегаполіса краіны толькі прыглядаюцца да сярэдніх цэннікаў прапановы. Нешта падобнае назіралася і сёлета ў студзені, калі ў Мінску было зафіксавана ўсяго каля 600 здзелак куплі-продажу аб'ектаў жылля. Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў.**

### АКТЫЎНАСЦЬ РАСЦЕ

Спадар Прасталупаў адзначае, што ўжо ў лютым патэнцыяльныя пакупнікі пачалі значна больш цікавіцца кватэрамі на другасным рынку сталіцы, аднак на выхадзе пакуль мы маем даволі сціплыя лічбы. Пра нейкі рэальны прарыў казаць цяпер зарана, бо ў чэрвені і ліпені штомесячная колькасць зарэгістраваных дагавароў куплі-продажы дасягала 1400.

Між іншым, заявы аб магчымым зніжэнні аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў Мінску выклікалі кароткачасовы ажыятаж сярод уласнікаў «лішніх квадратаў». Праўда, потым сітуацыю ўдакладніў міністр будаўнічай галіны Анатоль Чорны, які паведаміў, што ў бліжэйшыя два гады такога зніжэння ў сталіцы не будзе. Справа ў тым, што сёння ў Мінску існуюць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля, на якіх магчыма ўзвесці каля 7 млн квадратных метраў. Да 2017 года індустрыяльнае жыллёвае будаўніцтва ў сталіцы будзе ажыццяўляцца ранейшымі тэмпамі: каля 1 млн «квадратаў» сёлета і прыкладна мільён — у наступным годзе. А вось пасля вызначанай даты штогадовыя аб'ёмы будаўніцтва жылых дамоў у Мінску плануюць паэтапна паменшыць да 500 тысяч квадратных метраў, рэзюмаваў міністр.

СТАР. 4

■ Жывая зямля



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «КРАСУНЧЫК» ЗАЗІМАВАЎ У БАБЧЫНЕ

Старшы лабарант Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка Святлана Смяткіна пяць месяцаў даглядае бусліка, якога ў верасні мінулага года знайшлі ў вёсцы Савічы Брагінскага раёна. Птушка зімуе ў падвале навуковага цэнтра, ёй не пагражаюць ні моцныя маразы, ні голад. Пакуль бусліная папуляцыя недзе ў далёкай Афрыцы сумуе па Беларусі, буслік Красунчык — так называе яго апякунка Святлана, паволі дужэе і падрастае. Па паводзінах птушкі бачна, што дабрыня людзей прыйшлася ёй даспадобы: ахвотна ласуецца з рук «гаспадыні», адгукаецца на яе словы і, нягледзячы на холад і снег, спяшаецца за ёю на прагулку ў час абедзеннага перапынку. Ніколі раней Святлане не даводзілася мець справу з дзікімі птушкамі, даглядаць іх. Наогул, радыяцыйна-экалагічны запаведнік не займаецца ўтрыманнем жывёл і птушак. Сяброўства з буслом тут — усяго толькі выпадак. Як для птушкі, дык сапраўды шчаслівы.

СТАР. 3

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$15 млрд**

***інвестыцый уклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі (акрамя банкаў) замежныя інвестары за 2013 год. Гэта на 4,5% больш, чым за 2012 год. Асноўнымі інвестарамі арганізацый рэспублікі ў мінулым годзе былі суб'екты гаспадарання Расіі (48,6% ад усіх інвестыцый), Злучанага Каралеўства (21,4%), Кіпра (7,1%), Нідэрландаў (4,9%), а таксама Аўстрыі (3,4%). Найбольшыя сумы замежных інвестыцый паступілі ў арганізацыі гандлю (34,8% паступіўшых інвестыцый), транспарту (28,6%), прамысловасці (23,4%).***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9690,00 | ▲ |
| Еўра | 13230,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1131,35 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +4° |
| Віцебск | +4° |
| Гомель | +4° |
| Гродна | +3° |
| Магілёў | +4° |
| Мінск | +3° |

### КОРАТКА

Рашэнне аб тым, ці будзе для карыстальнікаў платных дарог Беларусі так званая амністыя часткі штрафаў жніўня-верасня, адкладваецца яшчэ на месяц.

Самы адчувальны для беларусаў рост цэн у студзені 2014 года быў на тытунёвыя вырабы (на 15,9%), а таксама на агародніну (на 14,6%). Крыху менш падаражэла бульба — на 9%.

Пры разліку сродкаў, што падлягаюць пазачарговаму пералічэнню плацяжоў на пагашэнне запазычанасці па заработнай плаце, наймальнікі павінны браніраваць у разліку на аднаго работніка Br1 млн 928 тыс. 390. Гэты нарматыў прымяняецца з 11 лютага гэтага года.

У Гродзенскай вобласці за тры гады колькасць наведвальнікаў музеяў павялічылася на 10,7%. У 2013 годзе ўсяго з улікам выставак, экспазіцый, іншых культурных мерапрыемстваў і праграм музеі Гродзенскай вобласці наведалі амаль 422 тыс. чалавек.

На 31-м кіламетры МКАД учора з-за перападу тэмператур у некалькіх месцах прасеў грунт. У выніку ўтварыліся ямы шырынёй амаль паўметра, глыбінёй 20—30 см. У іх трапілі больш за 10 аўтамабіляў, што скончылася для іх пашкоджаннем колаў і падвескі, утварыўся вялікі затор.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПРЭЗІДЭНТА РУМЫНІІ АШТРАФАВАЛІ ЗА ВЫКАЗВАННІ ПРА ЦЫГАНОЎ

Прэзідэнт Румыніі Траян Бэсеску быў аштрафаваны на 600 леяў (185 долараў) за выказванні, у якіх ён абвінаваціў цыганоў у дармаедстве і крадзяжах. Нацыянальны савет па барацьбе з дыскрымінацыяй спачатку не меў намеру разглядаць выпадак з прэзідэнтам, паколькі Бэсеску зрабіў гэтыя заявы, знаходзячыся за межамі Румыніі. Аднак Вярхоўны суд краіны абавязаў савет разгледзець гэтую справу. Бэсеску пакаралі за выказванні ў ходзе прэс-канферэнцыі ў Славеніі ў 2010 годзе. Ён заявіў тады, што «вельмі нешматлікія цыганы хочуць працаваць» і «традыцыйна многія з іх жывуць за кошт крадзяжу». Паводле афіцыйных звестак, у Румыніі пражывае 620 тысяч цыганоў.



### НАЦБАНК КАЗАХСТАНА ДЭВАЛЬВІРУЕ ТЭНГЕ

Нацыянальны банк Казахстана прыняў рашэнне з 11 лютага адмовіцца ад падтрымання абменнага курсу тэнге на ранейшым узроўні. «Каб не дапусціць дэстабілізацыі фінансавага рынку і эканомікі ў цэлым, Нацыянальным банкам будзе вызначаны калідор ваганняў курсу тэнге ў дачыненні да долара ЗША ад новага ўзроўню — 185 тэнге за долар ЗША плюс/мінус 3 тэнге...» — гаворыцца ў паведамленні. Нацбанк лічыць, што патэнцыял спекулятыўных дэвальвацыйных чаканняў будзе вычарпаны пры дасягненні абвешчанага арыенціра. Напярэдадні афіцыйны курс быў вызначаны на ўзроўні 155,5 тэнге за долар ЗША.

ISSN 1990 - 763X

### У БАЛГАРЫІ ЎВЯДУЦЬ ШТРАФЫ ЗА САМАСТОЙНЫ РАМОНТ АЎТАМАБІЛЯ

Улады краіны збіраюцца ўнесці ў закон «Аб дарожным руху» норму штрафу за самастойны рамонт аўто, паведамляюць інфармагенцтвы. Па звестках Bulgaria Today, кожны сэрвісны цэнтр, які займаецца рамонтам або абслугоўваннем транспартных сродкаў, павінен прайсці рэгістрацыю ў выканаўчым агенцтве Аўтамабільнай адміністрацыі. Сёння ў Балгарыі няма дакладных звестак пра колькасць сэрвісных цэнтраў у краіне. Ускладніць новы закон і тое, што ў краіне няма ніякага рэгламенту для гэтага віду дзейнасці, у сувязі з чым любы можа займацца рамонтам аўтамабіляў. Памер штрафу для фізічных асоб складзе 1000 леваў, або прыкладна 500 еўра. Аўтаўладальнікам будзе дазволена самастойна выконваць толькі дробны рамонт па інструкцыі.

### РАСІЙСКІЯ СМЕТНІКІ ЗАНЯЛІ ТЭРЫТОРЫЮ ДВУХ ІЗРАІЛЯЎ

Расійскія звалкі займаюць чатыры мільёны гектараў, паведамляецца на сайце Падліковай палаты РФ. Як адзначаюць інфармагенцтвы, гэта крыху менш, чым тэрыторыя Нідэрландаў (4,15 мільёна гектараў), у два разы больш за тэрыторыю Ізраіля (2,07 мільёна гектараў без уліку Галанскіх вышынь) і ў чатыры разы больш за тэрыторыю Кіпра (0,9 мільёна гектараў). Штогод для размяшчэння адходаў выдзяляецца 0,4 мільёна гектараў зямлі. Агульны аб'ём адходаў складае каля 90 мільярдаў тон, кожны год ён павялічваецца на пяць мільярдаў тон.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У НАРВЕГІІ ЗАПАТРАБАВАЛІ ПРАВЕСЦІ РЭФЕРЭНДУМ АБ МІГРАНТАХ

Прагрэсіўная партыя Нарвегіі, якая ўваходзіць у склад кіруючай кааліцыі, прапанавала правесці рэферэндум па пытанні аб абмежаванні міграцыі. Пра гэта са спасылкай на заяву прадстаўніка палітычнай арганізацыі Мазьяра Кешвары паведамляе агенцтва France-Presse. У партыі паказалі на вопыт Швейцарыі, насельніцтва якой на аналагічным рэферэндуме запатрабавала абмежавання ўезду для мігрантаў — членаў Еўрапейскага саюза. Нарвежскія «прагрэсісты» мяркуюць, што і ў іх краіне большасць хоча ўзмацнення жорсткасці заканадаўства ў гэтым пытанні, піша The Local. І Швейцарыя, і Нарвегія не з'яўляюцца членамі Еўрасаюза. Тым не менш, абедзве краіны ўваходзяць у Шэнгенскую і Еўрапейскую эканамічную зоны, што доўгі час дазваляла грамадзянам дзяржаў — членаў саюза лёгка перамяшчацца і знаходзіць працу на іх тэрыторыі.



■ Сустрэча без абцасаў

## «ТАК ЗАХАПІЛАСЯ ШАГАЛАМ, ШТО ЗАТАПІЛА СУСЕДЗЯЎ...»



**Падчас адкрыцця Алімпіяды ў Сочы расіяне вырашылі пазнаёміць іншаземцаў з рускай азбукай. Дзяўчынка ў відэаролiку на кожную літару знаходзіла слова, якое характарызавала Расію. На літару «Ш» зусім нечакана прагучала прозвішча Шагала. Як ставіцца да таго, што творцу, які нарадзіўся ў Беларусі, у чарговы раз прылічылі да расійскіх мастакоў? Пра гэта і не толькі наша размова з дырэктарам музея Марка Шагала ў Віцебску Людмілай Хмяльніцкай. Менавіта яна, дарэчы, дакументальна пацвердзіла, што Шагал правёў сваё юнацтва ў доме на Пакроўскай вуліцы ў Віцебску. З таго часу прайшло больш як 16 гадоў, а мастак працягвае акрыляць маю сённяшнюю гераіню...**

СТАР. 6

# «ТРЭБА АПЕРАТЫЎНА ВЫРАШАЦЬ ПЫТАННЕ З ЗАРОБКАМІ ПЕДАГОГАЎ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Маладыя маці не жадаюць надоўга выпадаць з актыўнай сферы, хочуць расці прафесійна. І мы павінны ім даць такую магчымасць. У сувязі з гэтым я звяртаюся да кіраўнікоў міністэрстваў адукацыі, юстыцыі, працы і сацыяльнай абароны — трэба падумаць, як падтрымаць прыватную ініцыятыву ў стварэнні і адкрыцці ўстаноў дашкольнай адукацыі. Чаму тую ж суму, якую мы выдаткоўваем з бюджэту на ўтрыманне выхаванцаў у дзяржаўных садках, не аддаць прыватнікам, якія гатовы прыйсці ў гэту сферу? — прапанаваў Анатоль Тозік.

Падчас калегіі прагучала прапанова «адпусціць» цэны на платнае навучанне ў вышэйшых навучальных установах, якія сёння жорстка рэгулююцца. Анатоль Тозік гэтую прапанову падтрымаў, падкрэсліўшы, што ўсё павінна каштаваць столькі, колькі яно каштуе. І дадаў, што гэтае пытанне можна было б перадаць на ўзровень устаноў адукацыі.

Сёлета будзе працягвацца праца над карэкціроўкай Кодэкса аб адукацыі. Віцэ-прэм'ер падтрымаў кіраўніка галіновай парламенцкай камісіі Генадзя Пальчыка, які прапанаваў максімальна спрасціць Кодэкс і зрабіць больш зразумелым:

— Трэба максімальна дэцэнтралізаваць права прыняцця рашэнняў. Перадаць такія правы не толькі на ўзровень аблвыканкамаў і райвыканкамаў, але і на ўзровень кіраўнікоў устаноў адукацыі, паколькі на месцах многія рэчы лепш відаць, чым нам наверсе, — патлумачыў сваю пазіцыю Анатоль Тозік.

Закранаючы пытанне размеркавання плыняў выпускнікоў, Анатоль Тозік канстатаваў, што «ў нас быў відавочны перакос, калі абсалютная большасць выпускнікоў накіроўвалася ва ўніверсітэты, і мы ўжо перайшлі мяжу разумнага»:

— Трэба адыходзіць ад такіх перакосаў. У нас цяпер абавязковая агульная базавая адукацыя. Значыць, ужо да 9-га класа трэба, каб дзеці, іх бацькі і настаўнікі ведалі, куды далей будзе накіроўвацца тое ці іншае дзіця. Калі яно ідзе ў старэйшыя класы, значыць, гэты малады чалавек першапачаткова павінен быць нацэлены на атрыманне вышэйшай адукацыі. І ў старэйшых класах трэба вызначацца з пэўным профілем адукацыі. А ў прафесійна-тэхнічных установах камусьці, магчыма, дастаткова будзе атрымаць толькі прафесію, без атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. Трэба фарміраваць такую структуру размеркавання плыняў выпускнікоў па ўзроўнях атрымання адукацыі, якая патрэбна краіне. Трэба фарміраваць павагу да рабочых прафесій. Галоўнае — даць чалавеку магчымасць знайсці сябе ў жыцці.

**«… вельмі хвалюе праблема якасці адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях і разрыў паміж сярэднім балам атэстатаў абітурыентаў і іх вынікамі на цэнтралізаваным тэсціраванні. Прычым гэты разрыў расце».**

Анатоль Тозік прызнаўся, што яго вельмі хвалюе праблема якасці адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях і разрыў паміж сярэднім балам атэстатаў абітурыентаў і іх вынікамі на цэнтралізаваным тэсціраванні. Прычым гэты разрыў расце.

Звяртаючыся да рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі, віцэ-прэм'ер папрасіў іх цаніць беларускія дыпломы і не гнацца слепа за выкананнем паказчыка экспарту адукацыйных паслуг. Анатоль Тозік падкрэсліў, што замежны грамадзянін, які прыехаў у Беларусь атрымліваць вышэйшую адукацыю, павінен прадэманстраваць веды, што дазваляюць атрымаць беларускі дыплом, і паводзіць сябе ён павінен у адпаведнасці з законамі нашай дзяржавы і нашага грамадства.

— Я прашу вас: не трэба закрываць вочы на якасць іх вучобы, на якасць ведаў і на іх паводзіны. Нам ні ў якім разе нельга страціць якасць і аўтарытэт нашых дыпломаў, — сказаў Анатоль Тозік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Камунальныя стасункі

# …ПЛЮС ГАЗІФІКАЦЫЯ ЎСЁЙ КРАІНЫ

## Колькі каштуе падвядзенне прыроднага газу, хто можа самастойна падключаць балон і як замяніць газавую пліту на электрычную



**Цягам года цэны на газ могуць індэксавацца пры ўмове росту заработнай платы. Пры гэтым памер павышэння цэн не павінен перавышаць тэмпаў росту заробку за мінулы квартал. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар ДВА «Белпалівагаз» Леанід РУДЗІНСКІ падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.**

### КОЛЬКІ ДАВЯДЗЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ?

У адпаведнасці з пастановай урада павышэнне кошту на газ ужо адбылося сёлета з 1 студзеня. Для абанентаў, у якіх усталяваны толькі газавая пліта або газавая пліта і газавы воданагравальнік, цана павялічылася на 30%. Калі ў спажыўца ўсталяваны газавыя лічыльнікі, плаціць за паліва давядзецца ў сярэднім на 2500 рублёў болей. Калі прыборы ўліку расходу газу адсутнічаюць, то пераплата будзе дасягаць каля 10500 рублёў за месяц. А для абанентаў, у якіх усталяваны газавыя ацяпляльныя катлы, тарыф на газ у ацяпляльны перыяд падняўся на 18,4%. Для гэтай катэгорыі насельніцтва сума аплаты павялічыцца на 50 тысяч рублёў за месяц.

### А Ў НАС У ДОМЕ ГАЗ. А Ў ВАС?

Зараз такая выгода, як прыродны газ, прыходзіць у сельскую мясцовасць. Як займець яе ў сваім доме?

Для таго, каб правесці газ да свайго прыватнага дома, трэба высветліць наяўнасць побач з ім вулічнага размеркавальнага газаправода. Калі ён ёсць, то трэба звярнуцца ў мясцовы выканкам з заявай на газіфікацыю жылога дома, а таксама з дакументамі, якія пацвярджаюць права ўласнасці на дом. Выканкам прымае рашэнне і самастойна цягам 10 дзён запытвае тэхнічныя ўмовы ў газазабяспечвальнай арганізацыі. Паводле іх праектуецца і будуецца ўнутрыдамовая сістэма газазабеспячэння.

У выпадку, калі газаправода на вуліцы няма, то яго неабходна правесці, але гэта вельмі дорага для адной-дзвюх сем'яў. Таму для скарачэння затрат грамадзяне могуць аб'ядноўвацца ў кааператывы. Кошт газіфікацыі жылога дома залежыць ад таго, якія аб'екты газаразмеркавальнай сістэмы неабходна будзе пабудаваць. Калі газаправод-увод да дома падведзены, то з улікам кошту матэрыялаў на бягучы момант і неабходнасці мантажу газаправода даўжынёй 20 м праектаванне і будаўніцтва складзе каля 7–8 млн рублёў.

### НЕЗАКОННАЯ ЎРЭЗКА НЕ ПРОЙДЗЕ

Для таго, каб у вёсцы падключыць дом да газаправода, які пабудаваў кааператыў, у якім вы дагэтуль не значыліся, таксама неабходна звярнуцца з заявай у гарадскі ці раённы выканкам. Ён запытае тэхнічныя ўмовы на газіфікацыю ў газазабяспечвальнай арганізацыі, якая і вызначыць магчымасць падключэння новага спажыўца да дзейнай сістэмы. Урэзка ў вулічныя размеркавальныя газаправоды праводзіцца толькі самой арганізацыяй. Несанкцыянаванае далучэнне да газаправода выкрываецца цягам месяца падчас абходу пры яго тэхнічным абслугоўванні.

Пры аказанні комплекснай паслугі газіфікацыі аднакватэрнага жылога дома і наяўнасці газаправода-ўводу ўсе работы выконваюцца цягам месяца з моманту падачы заявы ў выканкам. Пры гэтым уласнік павінен падрыхтаваць дом: завяршыць рамонтныя работы, а таксама работы па абсталяванні дымавых і вентыляцыйных каналаў і г. д. Але канкрэтныя тэрміны вызначаюцца паводле праектна-каштарыснай дакументацыі. Трэба ўлічваць, што рэгламентаваць усе прыватныя выпадкі і сітуацыі падчас правядзення газавых работ немагчыма.

### БЯСПЕКА — ПЕРАДУСІМ

Прыродны газ даступны не ўсім вяскоўцам, таму праблема бяспечнага абыходжання з газавымі балонамі застаецца актуальнай.

Магчыма і самастойна атрымліваць газавыя балоны, і падключаць іх да пліты, а таксама мець некалькі балонаў з газам пра запас. Але для таго, каб атрымліваць іх у філіялах газазабяспечвальнай арганізацыі, на газанапаўняльных ці аўтазаправачных станцыях, а таксама для самастойнай дастаўкі і замены балонаў ёмістасцю 50 і 27 літраў, неабходна мець допуск. Для балонаў 12 і 5 літраў ён не патрабуецца. Для атрымання допуску трэба звярнуцца ў філіял газазабяспечвальнай арганізацыі па месцы жыхарства з пашпартам і дагаворам — тэхпашпартам індывідуальнай балоннай устаноўкі ІБУ. Паколькі звадкаваны газ — выбухова- і пажаранебяспечнае рэчыва, захоўваць яго можна толькі ў спецыялізаваных складах. Звычайнаму карыстальніку рэкамендавана зманціраваць газабалонную ўстаноўку з двума балонамі.

### ВЫБАР НА КАРЫСЦЬ ЭКАЛАГІЧНАСЦІ

У Беларусі звадкаваны вуглевадародны газ шырока выкарыстоўваецца ў якасці аўтамабільнага паліва. Гэта больш экалагічна і эканамічна ў параўнанні з бензінам і дызпалівам. Каб прыстасаваць свой аўтамабіль пад газавае паліва, можна звярнуцца на спецыялізаваную станцыю, а таксама на Навагрудскі завод газавай апаратуры, які выпускае айчыннае абсталяванне для пераводу машын на звадкаваны газ.

### З ТРУБЫ — НА РАЗЕТКУ

Хтосьці імкнецца правесці газ у сваё жыллё, а нехта адмаўляецца ад яго на карысць электраэнергіі. І замяніць газавую пліту электрычнай магчыма. Для гэтага неабходна мець тэхнічную магчымасць падачы электрычнасці на пліту неабходных памераў. Гэтыя пытанні трэба вырашаць з электразабяспечвальнымі арганізацыямі, а ў выпадку шматкватэрнага жыллёвага фонду неабходна звярнуцца ў камунальныя службы. Калі дазвол на ўсталяванне электрапліты будзе атрыманы, варта звярнуцца ў газазабяспечвальную арганізацыю для дэмантажу газаправода і скасавання дагавора на газавае абслугоўванне.

**Падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

■ На шляху да дэмакратыі

# ЧАМУ БЕЛЬГІЙСКІЯ ФРАНЦУЗЫ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЖЭСТЫ?

**Краіны, у якой ідэальна выконваюцца ўсе правы чалавека, пакуль не існуе, лічыць Юрый АМБРАЗЕВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Таму з боку геапалітычна моцных краін з'яўляецца беспадстаўным навязваць больш слабым свае ўмовы двух- і шматбаковых адносін, устанаўліваць рэжым санкцый толькі з-за таго, што, маўляў, іх незадавальняе сітуацыя з правамі чалавека ў пэўнай краіне. Супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў падрыхтавалі даклад «Найбольш рэзанансныя выпадкі парушэнняў правоў чалавека за 2013 год», куды ўключылі вынікі назіранняў за выкананнем гэтага аспекту ў 23 краінах, якія ўстанавілі рэжым санкцый у дачыненні да Беларусі. Сярод іх 21 еўрапейская дзяржава, Злучаныя Штаты Амерыкі і Канада.**

«Дзеянні шэрагу дзяржаў наносяць шкоду Беларусі, яе прадпрыемствам і грамадзянам, — канстатаваў Юрый Амбразевіч. — Гэтыя краіны лічаць, што сітуацыя з правамі чалавека ў нас знаходзіцца не ў лепшым стане». Па словах дыпламата, менавіта на гэтай падставе ўрады многіх заходніх краін абмяжоўваюць палітычныя, ведамасныя кантакты з Беларуссю, уводзяць забарону на доступ на іх рынкі канкрэтных прадпрыемстваў, беларускіх тавараў, вядуць інфармацыйную дыскрэдытацыю нашай дзяржавы. «Такія дзеянні з боку замежных дзяржаў разглядаюцца намі як перашкоды, — падкрэсліў Амбразевіч. — І ліквідацыя гэтых перашкод з'яўляецца на сёння найважнейшай задачай для МЗС. На жаль, бо міністэрства вымушана траціць сілы, якія спатрэбіліся б для канструктыўнай працы».

У прэзентаваным зборніку, складзеным на аснове інфармацыі з адкрытых крыніц (вынікаў даследаванняў пазаўрадавых арганізацый, СМІ, дакладаў ААН), змешчаны выпадкі парушэння правоў чалавека менавіта ў тых краінах, якія лічаць, што яны маюць права дыктаваць Беларусі свае правілы правядзення ўнутранай палітыкі.

Напрыклад, у Бельгіі — сэрцы Еўрапейскага саюза — было груба парушана права на карыстанне роднай мовай. Улады горада Менена, які мяжуе з Францыяй, забаранілі адміністрацыі горада выкарыстоўваць на службе другую дзяржаўную мову Бельгіі — французскую: чыноўнікам забаронена размаўляць на ёй, загадана ліквідаваць усе французскія надпісы на ўказальных таблічках, у інструкцыях і афіцыйных дакументах; з наведнікамі прадпісана весці гутарку на нідэрландскай мове або… пры дапамозе жэстаў.

Паборнікі дэмакратыі ЗША пакуль што не думаюць зачыняць турму ў Гуантанама, нават нягледзячы на заяву Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека Нэві Пілэй. Паводле яе выказвання, турма ў Гуантанама павінна быць закрыта, і бестэрміновае ўтрыманне там зняволеных з'яўляецца відавочным парушэннем міжнароднага права.

Калі казаць пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, то Амбразевіч падкрэсліў, што краіна актыўна развівае сваё ўзаемадзеянне з міжнароднымі арганізацыямі, якія валодаюць кантрольнымі функцыямі ў сферы правоў чалавека. Так, за апошнія гады Беларусь прадставіла на разгляд кантрольных органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пяць перыядычных дакладаў па выкананні праваахоўных дагавораў: у Камітэт па правах дзіцяці, у Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, у Камітэт супраць катаванняў, у Камітэт па эканамічных, культурных і сацыяльных правах, у Камітэт па ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі. Усе гэтыя даклады былі паспяхова абаронены.

Акрамя гэтага, у маі 2010 года Беларусь прайшла свайго роду экзамен у Савеце па правах чалавека. Гутарка ідзе пра ўніверсальны перыядычны агляд сітуацыі па правах чалавека. Па выніках агляду на адрас нашай краіны былі сфармуляваны рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека, якія мы прынялі.

«Сапраўды, на адрас нашай краіны было сфармулявана дастаткова шмат рэкамендацый, — згадзіўся Амбразевіч. — Значная частка іх тычылася далучэння і ратыфікацыі тых ці іншых міжнародных дакументаў, дзесьці трэцяя частка была прысвечана правам жанчын, каля 20 рэкамендацый — тэматыцы смяротнага пакарання, таксама былі рэкамендацыі, датычныя катаванняў — пра далучэнне Беларусі да факультатыўных пратаколаў канвенцыі супраць катаванняў і правядзенне інвентарызацыі нашых турмаў».

На сёння ўжо ёсць значныя дасягненні ў рэалізацыі гэтых рэкамендацый. Дыпламат звярнуў увагу на тое, што Беларусь — адна з нямногіх краін свету, дзе практычна ўсе мэты развіцця тысячагоддзя выкананы (да іх, сярод іншых, адносяцца: ліквідацыя абсалютнай непісьменнасці і беднасці, забеспячэнне ўсеагульнай пачатковай адукацыі, садзейнічанне роўнасці мужчын і жанчын, пашырэнне правоў жанчын, скарачэнне дзіцячай смяротнасці). У нашай краіне дастаткова сур'ёзна пастаўлена праблема па барацьбе з гандлем людзьмі, прыняты спецыяльны закон. У Беларусі сфарміраваны дастаткова сур'ёзны баланс роўнасці паміж мужчынам і жанчынай. Што да рэалізацыі правоў дзіцяці, то ў нашай краіне рэалізуецца праграма згортвання інтэрнатаў. У бліжэйшы час будзе вырашана пытанне аб ратыфікацыі Канвенцыі па правах інвалідаў.

Даклад па выкананні правоў чалавека рыхтуецца другі год запар. Юрый Амбразевіч звярнуў увагу на той факт, што рэакцыя Бруселя летась на гэты дакумент — Еўрасаюз гатовы ўзаемадзейнічаць з Беларуссю па тэматыцы правоў чалавека і згодны выслухаць крытыку на свой адрас — успрымаецца беларускімі дыпламатамі як абсалютна прымальная. Дыпламат падкрэсліў, што Беларусь адкрытая для ўзаемадзеяння з замежнымі краінамі, у тым ліку заходнімі, па правах чалавека.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

**УВЕДОМЛЕНИЕ ОБ ОБЩЕСТВЕННОМ ОБСУЖДЕНИИ**

ПКУП «Жилкомплект» (220037, г. Минск, ул. Аннаева, 67; тел. +375 (17) 245 86 31; адрес электронной почты: gkpgkp@tut.by) совместно с администрацией Заводского района г. Минска (220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 17, адрес электронной почты: zav.glav.priem@minsk.gov.by, тел. +375 (17) 295 25 92, факс +375 (17) 295 72 32) уведомляют о начале процедуры общественного обсуждения отчета об оценке воздействия на окружающую среду архитектурного проекта **«Строительство комплекса по переработке битумосодержащих кровельных отходов в г. Минске».**

Планируемая деятельность заключается в строительстве комплекса по переработке битумосодержащих кровельных отходов. Проектируемый комплекс предназначен для переработки кровельных отходов; приготовления асфальтобетонных смесей, противогололедных составов, компоста, питательного грунта.

Строительство комплекса на ПКУП «Жилкомплект» вызвано прогнозируемым дальнейшим ростом объемов поступления отходов кровли и реализацией действующих законодательных норм в области обращения с отходами для их вовлечения в хозяйственный оборот.

**Целесообразность осуществления данного проекта состоит в следующем:**

- сокращаются объемы захоронения отходов рубероида;
- обеспечивается использование вторичных материальных ресурсов;
- уменьшается вред, наносимый окружающей среде, при захоронении отходов.

Строительство комплекса по переработке битумосодержащих кровельных отходов планируется по адресу: ул. Инженерная, 1л.

Срок реализации планируемой деятельности – 2017 г.

Общественное обсуждение проводится в срок с 12 февраля по 13 марта 2014 г.

С документацией по ОВОС можно ознакомиться в ПКУП «Жилкомплект» (ул. Аннаева, 67, 220037, г. Минск, контактное лицо Залесская С.А. тел. +375 (17) 245 86 32). Отчет об ОВОС будет размещен на сайте www.gilkomplekt.by и www.zav.minsk.gov.by.

Замечания и предложения по документации по ОВОС можно направлять на почтовый или электронный адрес ПКУП «Жилкомплект».

Прием обращений общественности о необходимости проведения собрания по обсуждению отчета об ОВОС проводится администрацией Заводского района г. Минска (220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 17, тел. +375 (17) 295 25 92) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня опубликования данного уведомления. В случае наличия заявления от общественности о необходимости проведения собрания по обсуждению отчета от ОВОС о дате и месте его проведения будет сообщено дополнительно.

УНП 100984075

Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0528372, 0636776, 0636794, страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР №№ 3485986, 5086441 **считать недействительными.**

УНП 100706519

14 марта 2014 г. в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2013 год и основные направления деятельности общества в 2014 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2013 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2013 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2014 году и первом квартале 2015 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 04.03.2014 г. (с 14.00 до 16.00), по месту нахождения общества.

УНН 400022625 Наблюдательный совет.

**ООО «БелИнвестОценка»**

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества**

**филиала «Нерудстройматериалы» ОАО «Дорстройиндустрия»**

**ЛОТ № 1**: **имущество участка «Загуздье», расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, д. Вировля в составе**: здания мастерской, здания насосной, склада, административного здания, здания столовой, площадкой возле административного здания асфальтобетонной, здания котельной с металлической трубой, здания весовой, зданием корпуса грохочения с галереей, площадкой под галереей бетонной, здания трансформаторной, зданием корпуса вторичного дробления с тремя галереями, зданием корпуса первичного дробления с галереей, зданием корпуса третичного дробления, очистных сооружений, артскважины бесфильтровой глубиной 86 м, ограждения металлического, водонапорной башни металлической, противопожарного резервуара железобетонного емкостью 150 куб.м, сетей электроснабжения протяженностью 3405 метров, слаботочных сетей протяженностью 85 метров, водонапорной сети протяженностью 420 метров, канализационных сетей протяженностью 258 метров, тепловой сети протяженностью 22 метра, четырех емкостей металлических для дизельного топлива, двух емкостей металлических для бензина, трансформатор ТМГ 400 10,04.

Начальная цена продажи **194 777 479 рублей*.** (**Цена объекта снижена на 50%).**

**1.** Аукцион состоится **25.02.2014 в 11.00** по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1.

**2.** Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели РБ, иностранные инвесторы. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка в размере **10%** от начальной цены продажи лота – **19 500 000 рублей**, юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ.лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Задаток перечисляется на р/с №3012150544012 в ЦБУ № 701 (г. Минск, ул. Чкалова, 18/1) ОАО «БПС-Сбербанк» код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

**3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 21.02.2014 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, пом. 416. Заключительная регистрация участников 25.02.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.**

**4.** Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**5**. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

**6**. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с продавцом имущества не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**7.** Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи. Конт. лицо: Жанна Леонидовна, тел. 8 (029) 106-90-60.

**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44; (029) 142-33-07; e-mail: belinvo@tut.by**

** – С учетом налога на добавленную стоимость.*

*Полное извещение о проведении торгов по продаже указанного лота было опубликовано в газете «Гостиный двор» 27.04.2012.*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**О ПРОВЕДЕНИИ 27 февраля 2014 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)** | **Самолёт «CESSNA CITATION X»*, девятиместный, с двумя турбореактивными двигателями, серийный номер 750-0300, регистрационный номер OE-HAK, 2009 год выпуска, цвет белый с красным.** |
| **Начальная цена** | 38 034 360 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 3 800 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

** Имущество реализуется без эксплуатационной (технической) документации.*

Местонахождение продаваемого имущества – территория аэропорта «Минск-1».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **27 февраля 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.02.2014 по 24.02.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22; (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

ИП Ширинский Сергей Александрович рег. номер. 191495334 ликвидируется. Претензии принимаются в течение 2-х месяцев с момента публикации объявления по тел. +375445730352.

Утерянное свидетельство о гос. регистрации № 191495334 ИП Ширинский Сергей Александрович **считать недействительным.**

Утерянное свидетельство о гос. регистрации № 191495334 ИП Ширинский Сергей Александрович **считать недействительным.**

### «ЛІШНІЯ» ГРОШЫ КАНФІСКАВАЛІ

**Два факты канфіскацыі буйных сум валюты, якую трэба было пісьмова дэклараваць, на працягу сутак зафіксаваны ў чыгуначным пункце пропуску «Церахоўка» Гомельскай мытні.**

Як паведамілі ў прэс-групе арганізацыі, беларускі, якія ехалі ва Украіну на поездзе «Мінск — Сімферопаль», адмовіліся запоўніць мытную дэкларацыю. Падчас кантролю ў адной было знойдзена $17340 і 60 тысяч расійскіх рублёў. Другая заявіла, што вывозіць толькі $9800. Але пад навалачкай яе падушкі знаходзіўся празрысты пакет з сумай у $1700. Мытнікі нагадваюць: як пры адначасовым вывазе, так і пры ўвозе грашовых сродкаў на тэрыторыю Мытнага саюза ў эквіваленце больш за $10000, уся сума павінна дэклáравацца пісьмова. У адпаведнасці з заканадаўствам усё, што гэтую суму перавышае, канфіскуецца. Што і было зроблена ў дачыненні дзвюх грамадзянак. Пачаты адміністрацыйныя працэсы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні начальніку вытворчага аддзела Кудзінай Вользе Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні вядучаму стылістычнаму рэдактару газеты «Звязда» Пятровічу Дзмітрыю Леанідавічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**ОАО «Минскторгмаш»**

**сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 14 марта 2014 в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22.**

**Повестка дня:**

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2013 г.
- Отчет ревизора.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках общества, переоценки основных средств.
- О выплате дивидендов за 2013 г.
- О проекте распределения чистой прибыли на 2014 г.
- Об избрании членов наблюдательного совета и ревизора.
- Об установлении вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизора.

**Регистрация начинается в 10.15. При себе иметь паспорт.**

УНП 100103798 *Наблюдательный совет.*

14 марта 2014 года в 16.00. состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2013 год и основные направления деятельности общества в 2014 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2013 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2013 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2014 году и первом квартале 2015 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Сантехэлектромонтаж»: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 04.03.2014 г. (с 14.00 до 16.00), по месту нахождения общества. УНП 400052115

■ Пытальнік

## ЧЭКІ — ПА НАТАРЫЯЛЬНА ЗАСВЕДЧАНЫМ ДАГАВОРЫ ДАРЭННЯ

***«Паважаная рэдакцыя! Звяртаецца да вас 80-гадовая пенсіянерка са слабым здароўем. У мяне маецца больш за сотню чэкаў «Жыллё», перарэгістраваных па стане на 1 студзеня 2007 года. Хачу ў вас спытаць: ці трэба афармляць працэс дарэння гэтых чэкаў унуку, які пражывае разам са мной і мае такое ж прозвішча? Ён стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў і цяпер уступіў у жыллёва-будаўнічы кааператыў. Дом знаходзіцца ў стадыі будоўлі. Неяк раней я чула, што чэкі «Жыллё» з'яўляюцца каштоўнымі паперамі. Ці магчыма даведацца пра кошт аднаго такога чэка?»***

**Марыя Іванаўна БАГДАНАВА,** *г. Мінск.*

Па просьбе рэдакцыі зварот пенсіянеркі быў разгледжаны адміністрацыяй Партызанскага раёна г. Мінска — па месцы жыхарства пенсіянеркі.

«На падставе Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.06.2005 г. № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», унук Багданавай М.І. мае права скарыстацца чэкамі «Жыллё» для фінансавання будаўніцтва жылля пры ўмове іх афармлення на яго імя па натарыяльна засведчаным дагаворы дарэння.

У адпаведнасці з рашэннем Мінгарвыканкама ад 14.11. 2013 г. № 2851, індэкс росту кошту будаўніцтва жылля для індэксацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» сёння складае 105947,1»

■ Факт

## ЧАРГАВІКОЎ ВЫЗВАЛІЛІ АД ПЛАТЫ ЗА ЗНОС ЖЫЛЛЯ

**Пра гэта гаворыцца ў адпаведнай пастанове Савета Міністраў, якая была падрыхтавана спецыялістамі Мінбудархітэктуры.**

Зацверджаны таксама парадак кампенсацыі заказчыкамі, забудоўшчыкамі жылых дамоў мясцоваму бюджэту кошту жылых памяшканняў, прызначаных для перасялення грамадзян з жылых дамоў, якія падлягаюць зносу ў сувязі з прадастаўленнем зямельных участкаў пад жыллёвае будаўніцтва. У дакуменце вызначаны парадак разліку ўсярэдненага паказчыка такой кампенсацыі.

Кампенсацыя заказчыкамі, забудоўшчыкамі не будзе рабіцца з агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія будуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, а таксама ўзводзяцца для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, адзначылі ў міністэрстве. Раней ад такіх выплат вызваляліся толькі тыя, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі.

**Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ** паведаміў карэспандэнту «Звязды», што цяпер ад платы, згодна з такой нормай, будуць вызваляцца ўсе чаргавікі па любой схеме шматкватэрнага будаўніцтва. Дарэчы, у грашовым вымярэнні ўсярэдненая норма зносу аб'екта па горадзе Мінску летась склала 7,2% ад агульнага кошту кватэры. Падобнае новаўвядзенне павінна сёлета зрабіць будаўніцтва жылля таннейшым менавіта для тых чаргавікоў, якія будуюць сабе кватэры без выкарыстання дзяржаўнай падтрымкі.

Пастанова ўступае ў сілу сёлета з 1 красавіка. Яе дзеянне не распаўсюджваецца на будаўніцтва жылых дамоў, на якія пачалася распрацоўка праектнай дакументацыі, альбо такая дакументацыя ўжо распрацавана і зацверджана да ўступлення ў сілу гэтага дакумента.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МОШЧЫ СВЯЦІЦЕЛЯ МІКАЛАЯ ПРЫБЫЛІ Ў ЖЛОБІН

У Жлобінскі храм у гонар святога пакутніка Іаана Воіна прывезлі часцінку мошчаў свяціцеля Мікалая. Гэтая святыня звычайна захоўваецца ў Свята-Мікольскім храме вёскі Жалезнікі Веткаўскага раёна, куды была прывезена з Кёльна тры гады таму. У інфармацыйным аддзеле Гомельскай епархіі паведамілі, што ўшанаваць мошчы жлобінскія вернікі змогуць да 9 сакавіка. Штодня ў храме ля мошчаў будуць здзяйсняцца набажэнствы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## «ТАРПЕДА» ВЯРТАЕЦЦА Ў ВЯЛІКІ ФУТБОЛ

**Сёлета мінскае «Тарпеда» плануе ўдзельнічаць у чэмпіянаце краіны па футболе сярод камандаў другой лігі.**

Балельшчыкі сталічных «аўтазаводцаў» паведамілі на сваім сайце пра тое, што дзеля гэтага ад Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама ўжо атрымана пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі спартыўнага грамадскага аб'яднання «Футбольны клуб «Тарпеда».

«Тарпеда» было заснавана ў далёкім 1947 годзе. Клуб 5 разоў перамагаў у чэмпіянаце БССР і да 2005 года выступаў у Вышэйшай лізе, пасля чаго трапіў у трэці дывізіён і праз пэўны час спыніў сваё існаванне. З 2007 года аматарскае «Тарпеда» выступала на першынстве горада. У розныя гады за каманду выступалі вядомыя айчынныя футбалісты — Сяргей Паўлюковіч, Алег Конанаў, Сяргей Яромка, бразілец Эду, расіянін Уладзіслаў Безбародаў, які пасля завяршэння спартыўнай кар'еры стаў даволі вядомым футбольным арбітрам.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## РАНА ПЕРАКРЫЛІ КОМІН

**У Мядзельскім раёне два чалавекі атруціліся чадам. На шчасце, да бяды не дайшло.**

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, бліжэй да вечара ў вёску Буйкі прыехалі 24-гадовая дзяўчына і яе 21-гадовы брат. Маладыя людзі завіталі пагасцяваць на дачу да роднага дзядзькі. На ноч прапалілі печ і ляглі спаць... Раніцай наступнага дня абодва адчулі агульнае недамаганне, а бліжэй да вечара звярнуліся ў бальніцу. Стан пацярпелых здавальняючы. Прычына здарэння — рана зачыненая юшка.

А выратавальнікі нагадваюць, што заканчваць прапальваць печ трэба не пазней, чым за дзве гадзіны перад адыходам да сну.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «КАНЦЫ Ў ВАДУ» СХАВАЦЬ НЕ АТРЫМАЛАСЯ

**Каля вёскі Агароднікі Лідскага раёна былі затрыманы тры браканьеры з пасёлка Бярозаўка. Маладыя людзі (двое з іх — браты) падазраюцца як у незаконнай здабычы дзікіх жывёл, так і ў здзяйсненні іншых супрацьпраўных дзеянняў, у тым ліку — у дачыненні да нелегальнага абароту зброі.**

— Пры затрыманні ў парушальнікаў канфіскавалі дзве незарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы і патроны. Яшчэ два незарэгістраваныя «ствалы», а таксама 35 патронаў, чатыры бляшанкі пораху і пакет з карцеччу былі знойдзены пазней у доме аднаго з затрыманых, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Як устанавілі дзяржінспектары падчас скрытага назірання, група прамышляла незаконнымі паляваннямі на тэрыторыі Лідскага, Навагрудскага, Іўеўскага і Дзятлаўскага раёнаў. Дакладна вядома, што ў сярэдзіне студзеня браканьеры незаконна здабылі лася і казулю, рэшткі якіх скінулі з мастоў у Нёман.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Абмяркуем

# ЯК НАСТАЎНІКУ НЕ СТАЦЬ «АЎТСАЙДАРАМ» У ГРАМАДСТВЕ?

**Што рухае маладымі людзьмі, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці? Чаму ў настаўнікі не ідуць лепшыя вучні? Да чаго павінны быць падрыхтаваныя будучыя педагогі? Ад чаго залежыць імідж настаўніка ў грамадстве? І, нарэшце, як затрымаць маладых спецыялістаў у сістэме адукацыі? Усе гэтыя пытанні абмяркоўваліся падчас «круглага стала», які прайшоў у рамках фестывалю «Педагог-майстар — маладому настаўніку». Да дыскусіі былі запрошаны як прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, педагогі, якія рыхтуюць будучых настаўнікаў, так і самі маладыя спецыялісты. Але ці пачулі яны адзін аднаго?**

Журналісты ўжо прызвычаіліся да таго, што... менавіта іх абвінавачваюць у падзенні прэстыжу ў грамадстве прафесіі педагога. Маўляў, навошта вы топчаце нашу прафесію? Замест таго, каб рабіць героямі дня Педагогаў з вялікай літары, фарміраваць пазітыўнае бачанне школы, падкрэсліваць выключнасць місіі настаўніцкай прафесіі, засяроджваеце ўвагу толькі на праблемах: на нізкай «якасці» абітурыентаў, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці, іх дрэннай матываванасці, маленькіх заробках настаўнікаў і гэтак далей. Без такіх абвінавачанняў не абышлося і на гэты раз. Але менавіта згаданыя праблемы ў выніку і аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў дыскусіі. Гэта лішні раз пераканала — шукаць адказы на пастаўленыя пытанні ўсё ж давядзецца.

### Прафесія ці дыплом?

**Першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Аляксандр АНДАРАЛА** ўпэўнены, што настаўнік «пачынаецца не з педуніверсітэта» — «гадаваць» будучых педагогаў павінны яшчэ ў школе.

— Асноўныя «пастаўшчыкі» абітурыентаў для нашага ўніверсітэта — сталіца і Мінскі рэгіён. Між іншым, толькі ў Мінску налічваецца больш як 200 школ. Плюс каля 500 агульнаадукацыйных устаноў працуюць у Мінскай вобласці. І калі б кожная школа накіравала да нас хоць аднаго свайго выпускніка, то ў нас быў бы сур'ёзны конкурс сярод прэтэндэнтаў. Самастойна педагагічны ўніверсітэт проста фізічна не ў сілах дайсці да кожнай школы. Каб прапагандаваць педагагічную прафесію, мы выступаем на тэлебачанні, у друкаваных сродках масавай інфармацыі, арганізуем «Зорныя паходы»: падчас зімовых канікул нашы студэнты і выкладчыкі праводзілі прафарыентацыйную работу ў шасці раёнах у розных абласцях, дзе выступалі перад школьнікамі, расказвалі ім аб жыцці педуніверсітэта, студэнцкім жыцці, агітавалі за сваю прафесію.... Але ж і настаўнікі павінны думаць над тым, хто прыйдзе ім на змену. Школы павінны хварэць за гэта душой!

На жаль, даводзіцца канстатаваць, што да нас прыходзяць сёння не самыя падрыхтаваныя і матываваныя абітурыенты. Летась мы прынялі 84 чалавекі на «фізіку», але на працягу года па розных прычынах адлічылі з першага курса 40 чалавек. Як той казаў, **з дрэннага сукна добры шынель не пашыеш — вучыць далей студэнтаў, якія не разбіраюцца ў элементарных рэчах, мы не можам,** — падкрэслівае Аляксандр Андарала.

— У кожнага чалавека ў жыцці ёсць людзі, якіх ён лічыць сваімі настаўнікамі. Мае настаўнікі падштурхнулі мяне да выбару прафесіі, і пра свой выбар я ніколі не пашкадаваў, — прызнаецца **намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ.** — Лічу, што сваім стаўленнем і да работы, і да жыцця настаўнік павінен быць для маладога пакалення прыкладам. Настаўнік — гэта не проста прафесія. Нельга быць настаўнікам з 8 гадзін раніцы да 17-ці. Гэта работа 24 гадзіны на суткі і 365 дзён на год. І я лічу, што гэта вялікі грэх, калі настаўнік не арыентуе, не агітуе сваіх вучняў за прафесію педагога.

— Каб выпускнік пайшоў на педагагічную спецыяльнасць, важна, каб яшчэ ў школе ён аказаўся ў акружэнні высакакласных педагогаў, — падзяліўся сваімі думкамі **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА**. — Але калі дзіця бачыць, што настаўнік адчувае сябе непаўнацэнным, то ён, безумоўна, у гэту прафесію ніколі не пойдзе. Настаўнік не павінен адчуваць сябе аўтсайдарам у грамадстве!

**За дваццаць гадоў у краіне з'явілася вялікая колькасць людзей з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі, але без вышэйшай адукацыі!**

— А ці не лічыце вы, што мы рыхтуем зашмат педагогаў? — пацікавіўся Васіль Будкевіч меркаваннем першага прарэктара БДПУ. — Мы ўжо забяспечылі педагогамі і вакзалы, і аэрапорты, і турыстычныя фірмы. Можа, трэба рыхтаваць менш ды лепш? Упор рабіць не на колькасць, а на якасць? У савецкія часы нашы ўстановы адукацыі выпускалі крыху больш за 4 тысячы педагогаў, а школьнікаў у краіне было ўдвая больш. Летась выпуск склаў 9 200 чалавек. З іх размеркаваныя былі 6 283 маладыя спецыялісты. За дваццаць гадоў у краіне з'явілася вялікая колькасць людзей з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі, але без вышэйшай адукацыі! Я асабіста вельмі хвалююся за тое, што ў школы прыйдуць выпускнікі платнай формы навучання, для якіх педагагічная спецыяльнасць была «запасным варыянтам» і якія не змаглі знайсці сябе прымяненне ў іншых сферах. А добра падрыхтаваныя выпускнікі пасля двух гадоў адпрацоўкі па размеркаванні знойдуць сабе работу, дзе ім будуць плаціць «крышачку больш», чым у школе.

— Сапраўды, у савецкія часы маладыя людзі ішлі вучыцца для таго, каб атрымаць прафесію, а не дыплом. А пазабюджэтнікі ў пераважнай сваёй большасці прыходзяць да нас не па прафесію, а па вышэйшую адукацыю. І толькі адзінкі з іх выказваюць жаданне працаваць па атрыманай спецыяльнасці. Што тычыцца лічбаў, то тут усё залежыць ад таго, як весці падлікі. Раней мы выпускалі толькі настаўнікаў-прадметнікаў, а цяпер рыхтуем і псіхолагаў, і сацыяльных педагогаў. Для таго, каб не забяспечваць педагогамі ўсе іншыя сферы, трэба ўзяць на ўзбраенне досвед Масквы. У расійскай сталіцы колькі гадоў таму была катастрафічная сітуацыя з педагагічнымі кадрамі, затое сёння, каб уладкавацца ва ўстанову адукацыі, трэба прыкласці шмат намаганняў. А ўсё таму, што заробак у педагогаў не можа быць меншым, чым сярэдні заробак па Маскве. Вось вам і адказ на ваша пытанне. Калі б нашым педагогам паднялі заробкі і ўсе настаўнікі, якія былі вымушаны адмовіцца ад прафесіі, зноў вярнуліся ў сістэму адукацыі, то мы б не думалі, як закрыць вакансіі ў дзіцячых садках ці дзе ўзяць настаўнікаў фізікі і матэматыкі...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Са студэнцкай лаўкі — адразу ў «бой»?

— Ідэя падцягнуць заробкі педагогаў да сярэдняга заробку ў рэгіёне мне падабаецца, — падхапіў **настаўнік фізікі сярэдняй школы № 26 г. Гродна Сяргей ФАДЗІН**, дарэчы, малады спецыяліст. — Хачу расказаць, з якімі праблемамі давялося сутыкнуцца асабіста мне пасля таго, як прыйшоў у школу. На мяне звалілася вялікая колькасць нарматыўных дакументаў, у якіх трэба было разабрацца, каб прымяняць іх на практыцы. Прабелы адчуваліся і ў псіхалагічнай падрыхтоўцы. Псіхалогія ва ўніверсітэце быццам бы і вывучаецца, хоць і непрацяглы час, але да работы з «жывымі людзьмі» мы не зусім падрыхтаваны. Таму і ўзнікалі шматлікія пытанні. А калі табе яшчэ адразу даюць класнае кіраўніцтва, то трэба наладжваць стасункі ўжо не толькі з дзецьмі, але і з іх бацькамі.

**Настаўнік гісторыі Бабініцкай сярэдняй школы Віцебскага раёна Аляксандр ПРОХАРАЎ** падтрымаў свайго калегу:

— Хацелася б акцэнтаваць увагу на вялікай колькасці папер, якія даводзіцца афармляць і запаўняць настаўніку. Малады спецыяліст прыступае да работы 15 жніўня. З вучнямі ён знаёміцца толькі 1 верасня. А акт абследавання сем'яў усіх сваіх навучэнцаў класны кіраўнік павінен здаць ужо да 10 верасня. Да таго ж у сельскай мясцовасці ёсць свае нюансы. Адлегласць ад школы да месца пражывання аднаго з маіх вучняў — 15 кіламетраў. Да таго ж мы павінны не менш чым раз на тыдзень наведваць сем'і, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы і складаць адпаведныя акты. Робім мы гэта ў свой асабісты час. У маім класе такіх вучняў двое. У іншых — тры-чатыры. Вяртаюся дадому ў цемры. Да таго ж і за прыгарадныя аўтобусы даводзіцца плаціць з уласнай кішэні.

Праз паўгода я страчу даплату як малады спецыяліст — сёння гэта 260 тысяч. І нават прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі гэтую даплату не кампенсуе.

Што тычыцца прадмета, які я выкладаю, то скажу, што вельмі складана спачатку паўгода выкладаць пэўны перыяд курса сусветнай гісторыі, а потым паўгода, забыўшыся пра сусветную гісторыю, праводзіць заняткі па гісторыі Беларусі. Невялікая колькасць гадзін, прадугледжаных на вывучэнне гісторыі Беларусі, прывядзе да таго, што гісторыю роднай краіны мы хутка забудзем. Да таго ж і замежная мова выкладаецца ў школе ў разы больш, чым родная. Яшчэ адна праблема — выкладанне гісторыі Беларусі на рускай мове. Я скончыў школу ў 2007 годзе. Гісторыю Беларусі мы вывучалі на беларускай мове. Ва ўніверсітэце гісторыя Беларусі таксама выкладалася на беларускай мове. А ў школе немагчыма гэта рабіць, паколькі падручнікі ёсць толькі на рускай мове.

### Час на адаптацыю

Васіль Будкевіч кажа, што не разумее, на якую «кіпу папер» скардзяцца маладыя настаўнікі, а вось з тым, што маладым спецыялістам трэба даць час для адаптацыі, а не кідаць іх на класнае кіраўніцтва як у вір з галавой, пагаджаецца:

— Педагогам-пачаткоўцам трэба даць год—два, каб яны ўвайшлі ў прафесію і адчулі сябе не студэнтамі на практыцы, а педагогамі. Каб асэнсавалі і зразумелі гэты стан. Калі я прыйшоў у школу, мне не далі адразу класнае кіраўніцтва. Паказалі чацвёрты клас і сказалі, што ў наступным годзе я буду працаваць у ім класным кіраўніком. Я прысутнічаў у гэтым класе на працягу года на многіх мерапрыемствах, дзеці і бацькі мяне бачылі і ведалі. І я з радасцю чакаў 1 верасня, каб стаць у дзяцей класным кіраўніком.

Між іншым, у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (АПА) на працягу васьмі гадоў вядзецца даследаванне па вывучэнні цяжкасцяў, якія ўзнікаюць у працэсе работы маладых настаўнікаў. У ім удзельнічаюць не толькі педагогі, якія прыступілі да работы, але і кіраўнікі ўстаноў адукацыі.

— У многім думкі маладых педагогаў і кіраўнікоў супадаюць. І моладзь, і кіраўнікі дастаткова высока ацэньваюць кампетэнтнасць маладых настаўнікаў у прадметнай галіне — ад 60 да 80% у розныя гады, — расказала **начальнік аддзела сацыялогіі адукацыі і павышэння кваліфікацыі Вераніка РЭУТ**. У чым сёння малады педагог, на яго думку, недастаткова сфарміраваны? Недастаткова сфарміраваныя ўменні ў галіне выхаваўчай работы — уменні працаваць з бацькамі, з дзецьмі з дэвіянтнымі паводзінамі, праводзіць інавацыйную дзейнасць.

**«Мы ўжо забяспечылі педагогамі і вакзалы, і аэрапорты, і турыстычныя фірмы. Можа, трэба рыхтаваць менш ды лепш? Упор рабіць не на колькасць, а на якасць?»**

У 2006—2007 гадах самымі праблемнымі для маладога настаўніка былі недастатковая метадычная падрыхтоўка, недасканаласць нарматыўна-прававой базы, у якой ён дрэнна арыентаваўся, аднастайныя формы і метады работы з маладымі педагогамі. У 2008—2009 гадах «праблемныя» акцэнты змясціліся ў іншы бок: арганізацыя настаўніцтва ва ўстанове адукацыі, валоданне інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі. Сёння маладыя педагогі адчуваюць патрэбу ў развіцці дыстанцыйнай сістэмы падтрымкі педагога, у арганізацыі цьютарства (кансультавання). Пераважная большасць педагогаў выступае з прапановай правядзення анкетавання ці тэсціравання на прафесійную прыдатнасць пры прыёме ў ВНУ...

### Інтэрнатура для педагогаў

Дарэчы, у Расіі, дзе таксама заклапочаны нізкай матываванасцю абітурыентаў, якія ідуць на педагагічныя спецыяльнасці, і слабай падрыхтоўкай маладых педагогаў, каб зламаць гэту тэндэнцыю, вырашылі кардынальна перабудаваць сістэму педагагічнай адукацыі і распрацавалі канцэпцыю падтрымкі развіцця педагагічнай адукацыі. Згодна з гэтай канцэпцыяй, абітурыенты пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці будуць праходзіць псіхалагічнае тэсціраванне, паколькі педагогіка — прафесія не для кожнага.

— Мы як прафсаюз марым пра тое, каб для маладых педагогаў быў створаны інстытут накшталт інтэрнатуры ў медыцыне, г. зн., каб наш малады спецыяліст меў паўгода або некалькі месяцаў для адаптацыі, каб ён проста мог папрысутнічаць на ўроках і прыглядзецца, як працуюць больш вопытныя настаўнікі, — падкрэсліў Раман Дапіра. — А калі ў маладога педагога нагрузка 27 гадзін на тыдзень ці яшчэ большая, то ён, безумоўна, не будзе бачыць, як працуюць іншыя. І гэта не вельмі добра. Бо настаўніцтва пачынаецца там, дзе не проста замацавалі педагога за маладым спецыялістам, а дзе малады спецыяліст мае магчымасць паглядзець, як гэты настаўнік працуе.

Сёння наймальніку ў сістэме адукацыі вельмі складана падвесці матывацыйную базу пад тое, каб малады спецыяліст застаўся ў яго працаваць. Мы з Міністэрствам адукацыі адсочваем, як у рэгіёнах плануюцца сродкі на павышэнне заработнай платы педагагічным работнікам. Сёння наша ўвага прыкаваная да большай дыферэнцыяцыі аплаты працы паміж педагагічнымі работнікамі, якія маюць першую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Для нас гэта асноўная задача. Магчыма, яе вырашэнне і падштурхне маладых спецыялістаў паглядзець на школу і ўвогуле на сістэму адукацыі як на сістэму свайго доўгатэрміновага развіцця, сваёй доўгатэрміновай кар'еры.

Для таго, каб зацікавіць маладога педагога і падтрымаць яго матэрыяльна, нярэдка кіраўнікі даюць яму вялікую колькасць гадзін. Праўда, вялікую колькасць гадзін маладым «уручаюць» і па прычыне дэфіцыту ў школе педагогаў таго ці іншага профілю. Але пра якую якасць працы можа весціся гаворка, калі на нявопытнага педагога звальваюцца 30-36 гадзін на тыдзень плюс класнае кіраўніцтва?

Як прызнаўся адзін з маладых педагогаў падчас «круглага стала», калі ты ідзеш з дому а палове восьмай раніцы і прыходзіш а восьмай вечара, калі ў цябе няма «фортак» паміж урокамі, і ты вяртаешся дамоў пасля 12 гадзін бесперапынных зносін з дзецьмі, іх бацькамі і калегамі, а цябе дома чакае яшчэ падрыхтоўка да ўрокаў, напісанне планаў і розных справаздач, падрыхтоўка да шостага школьнага дня, пазакласных мерапрыемстваў, а ты бачыш, як іншыя людзі адпачываюць ці рыхтуюцца да свята, то думаеш толькі пра адно: «Навошта мне такое шчасце?»

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# «КРАСУНЧЫК» ЗАЗІМАВАЎ У БАБЧЫНЕ



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Птушку ў навуковы гарадок Бабчын прывёз дырэктар запаведніка Пётр Кудан. Ад яго пачуў наступную гісторыю:

«Наведваючы сваю радзіму, убачыў на вясковай вуліцы гэтага небараку. Жыхары Савічаў дужа прасілі дапамагчы, бо ў птушкі было пашкоджана крыло і яна магла стаць здабычай сабак альбо лісы. Давялося забраць і перадаць работнікам аддзела радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу нашага навуковага цэнтра, якія палюбілі бусла. Асабліва клапоціцца пра птушку Святлана Смяткіна — яна нібы паставіла перад сабою мэту выхадзіць нечаканага госця. Спадзяёмся, што вясною бусел сапраўды стане на крыло і сустрэнецца са сваімі белакрылымі братамі. Няволіць яго мы не збіраемся, хоць дужа прывыклі да яго, пасябравалі».

Святлана Смяткіна хутка вывучыла гастранамічныя схільнасці свайго выхаванца. Бусел аказаўся сапраўдным гурманам і, каб дагадзіць птушцы, Святлана набывае для Красунчыка толькі



марожаную рыбу — селядцоў, мойву. А яшчэ і вараную каўбасу, асабліва «Доктарскую».

Прагульваючыся па навуковым падворку, бусел раз-пораз спрабуе свае крылы, робіць імі ўзмахі, дэманструючы, што раны сапраўды загойваюцца. Якой жа радасцю будзе для ўсіх той дзень, калі птушка здолее падняцца ў неба!

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

**Фота аўтара.**

*Хойніцкі раён.*

■ Прэм'ера рубрыкі: BusinessКрок

**Чытачы часта звяртаюцца ў рэдакцыю з пытаннямі аб тым, як адкрыць сваю справу — якім чынам афарміць дакументы, з чаго ўвогуле пачынаць, як дзейнічаць, калі ёсць толькі ідэя. Каб задаволіць гэты інфармацыйны попыт, «Звязда» пачынае новую рубрыку — «BusinessКрок». У ёй мы будзем расказваць пра асаблівасці стварэння ўласнага бізнесу, публікаваць парады спецыялістаў і экспертаў. Калі ў вас ёсць нейкія канкрэтныя пытанні, звязаныя са сваёй справай, дасылайце іх, калі ласка, на электронную пошту газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці задавайце па тэлефоне 8 017 292 38 02.**



# ІДЭЯ — ГЭТА ЎЖО ПАЧАТАК

## Але распачынаць бізнес трэба свядома

**Калі вы хочаце мець сваю справу, то гэты тэкст будзе карысным для вас. Можа быць, ён стане стымулам для дзеяння па даўно задуманым плане ці нагодай для змены працы. Сёння мы разгледзім шлях стварэння ўласнага бізнесу і тое, што ж з ім рабіць далей. Таксама апішам памылкі, якія найбольш часта робяць пачаткоўцы, і параім, як іх пазбягаць і выпраўляць.**

Такім чынам, калі вы падумваеце аб бізнесе альбо ўжо маеце нейкую справу, то, напэўна, у вас ёсць:

— ідэя;

— прататып яе рэалізацыі;

— магчымы прадукт;

— кліенты;

— людзі, якія будуць выконваць розныя дзеянні і аперацыі: продаж; прыём заказаў; прыём плацяжоў; афармленне бухгалтарскай і іншай справаздачнасці...

— а галоўнае — бізнес-мадэль.

### ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ?

Мэта, Бачанне і Місія — гэта тры пытанні, на якія вы павінны адказаць, гэта неад'емныя складнікі вашага бізнесу. У наступных матэрыялах мы пагаворым пра іх і разбяром кожны складнік паасобку.

Цяпер жа вырашым, што больш важна: план або бізнес-мадэль? Вядома, і адно, і другое мае важнае значэнне. Насамрэч у кожнага з гэтых дакументаў ёсць свая карысць, задача і прызначэнне. Гэта дзве важныя часткі вашага бізнесу. Прызначэнне бізнес-плана: заключыць у сабе апісанне мэт вашага бізнесу і спіс задач, якія неабходна вырашыць на шляху да мэты. А бізнес-мадэль, у сваю чаргу, дапамагае вам з асноўнымі пытаннямі:



«Як будзе наладжаны бізнес у якасці стратэгіі па зарабляннi грошай?», «Якія элементы павінен змяшчаць бізнес?». Пагадзіцеся, што, толькі склаўшы гэтыя два кампаненты, вы атрымаеце максімальную колькасць адказаў датычна стварэння і пабудовы бізнесу.

### У ЯКІМ КІРУНКУ ПАЧАЦЬ СВАЮ СПРАВУ?

Гэта залежыць ад вашага жадання, рашэння, бачання перспектыў рынку і нішы.

З чаго пачаць, маючы ідэі, сілы і ўсведамленне, як і што трэба рабіць, калі вы яшчэ афіцыйна працуеце? Калі ў вас пакуль ёсць пастаянная зарплата (хоць і невялікая), але вы ўжо дакладна для сябе вырашылі, што трэба гэта мяняць? Першае — гэта рашэнне. Усвядомленае, сур'ёзнае рашэнне, што вы сапраўды будзеце будаваць свой бізнес. Навучанне поспеху прыйдзе праз пераадоленне.

«Ці трэба мне адразу кідаць усё і прыступаць да дзеяння?» — спытаеце вы. Я б не раіў... Пакуль вы яшчэ працуеце, падрыхтуйцеся. Вывучыце рынак, знайдзіце ідэю і сваю нішу, зразумейце, якую карысць прынесяце менавіта вы. Прыдумайце сваю прапанову: што трэба рынку і вашаму мэтаваму кліенту. Пашукайце падобныя тавары. Паглядзіце, як яны прадаюцца, каму падабаюцца. Важны момант: калі ёсць тавары аналагічныя вашаму, гэта не значыць, што ніша занятая і вам там рабіць няма чаго. Гэта сведчыць пра тое, што ў гэтай нішы ёсць попыт і кліенты, якім у далейшым зможаце прадаваць і вы. Ну а калі аналагаў няма, то гэта не значыць, што выбраная ніша ўнікальная і вас там прымуць. Магчыма, у гэтай нішы няма попыту альбо няма рынку. У асобных выпадках вы можаце сапраўды знайсці пустую ўнікальную нішу.

### ЗАГАДЗЯ ЎСЁ ПРАТЭСЦІРУЙЦЕ

Памятайце, што ёсць бізнес-мадэль, а ёсць front-end (гэта «твар», які бачаць канкурэнты і пакупнікі). Калі вы вырашылі, на які рынак і з якой прапановай пойдзеце, не спяшайцеся. Ваша бізнес-мадэль — усяго толькі гіпотэза, здагадка. Яе трэба тэсціраваць, правяраць; атрымаць звесткі, што яна будзе працаваць; абзавесціся кантактамі, першымі кліентамі, здзейсніць продажы. Пераканайцеся, што гэты працэс паўтараецца і працуе, толькі тады вы можаце стварыць бізнес, які сапраўды функцыянуе. З працы можна сыходзіць тады, калі ваш прыбытак пачне перавышаць бягучыя даходы. Далей вашаму бізнесу неабходна жыць. А жыццё — у руху, у пастаянным росце і развіцці.

**Андрэй МЯСНІКОЎ, бізнес-кансультант, бізнес-трэнер.**

# ...ЗАГАДАЛІ ТАННЕЦЬ

### ПРАПАНОВА ПЕРАВЫШАЕ ПОПЫТ

Як паведаміў спадар Прасталупаў, колькасць агульнай базы мінскіх кватэр на продаж працягвае павялічвацца яшчэ з верасня. Сёння на сталічным другасным рынку жылля назіраецца амаль максімальная колькасць прапаноў, калі ў адначасовым продажы налічваецца ўжо больш як 7 тысяч кватэр. Асобныя эксперты рынку ўпэўнены, што і надалей колькасць прадаўцоў стандартнага жылля будзе толькі расці. Здаецца, што гэта павінна прывесці да масавага патаннення ўжо ўсіх тыпаў жылля. Аднак наш эксперт адзначае, што прыкладна 80% кватэр, што прапануюцца ўласнікамі, патэнцыяльных пакупнікоў увогуле не турбуе. Гэта звязана з тым, што цяпер толькі кожная пятая кватэра на рынку рэальна суадносіцца як па кошце, так і па якасці прапановы. Большая частка гаспадароў жыллёвай нерухомасці не згаджаецца з існуючай тэндэнцыяй і на сур'ёзныя зніжкі не ідзе.

### АДНАПАКАЁЎКУ МОЖНА АДШУКАЦЬ ПА ЦАНЕ ДА 55 ТЫСЯЧ USD

Зусім слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры на крайніх паверхах старых пяціпавярховых дамоў прапануюцца цяпер за 53-57 тысяч долараў. Часам невялікія аднапакаёвыя жылыя памяшканні, плошчай да 34 квадратных метраў, прапануюцца па кошце да 60 тысяч долараў і ў дзевяціпавярховых дамах. Два месяцы таму кватэр па такім кошце на рынку не хапала, а цяпер у агульным гарадскім каталогу знаходзіцца больш як сотня падобных варыянтаў. Павялічыўся выбар маленькіх аднапакаёвак у спальных раёнах сталіцы, дзе яны маюць цэннік у межах 62-70 тысяч долараў. Менавіта на цэннік ад 65 да 75 тысяч долараў прыпадае самая вялікая колькасць прапановы аднапакаёвых кватэр.

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр у Мінску пачынаецца з 62-64 тысяч долараў. Па такім кошце можна набыць сапраўды маленькую двухпакаёвую маласямейку агульнай плошчай ад 40 да 44 квадратных метраў на крайніх паверхах старых дамоў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падобныя па якасці кватэры ў спальных раёнах прапануюцца ўжо да 68-73 тысяч долараў. Крыху большыя па плошчы двухпакаёвыя «хрушчоўкі» і стандартныя не вельмі якасныя «двушкі» выстаўляюцца на продаж па кошце да 80 тысяч долараў. Двухпакаёўкі агульнай плошчай ад 46 да 58 «квадратаў» крыху лепшай якасці ўжо ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць да 90 тысяч долараў.

> **Менавіта на цэннік ад 65 да 75 тысяч долараў прыпадае самая вялікая колькасць прапановы аднапакаёвых кватэр.**

Самы малы цэннік на трохпакаёўкі выстаўлены на кватэры агульнай плошчай ад 50 да 56 квадратных метраў. Падобнае жыллё прапануецца па кошце ад 72 да 84 тысяч долараў. Праўда, такіх танных варыянтаў на рынку засталося не больш за 10. Стандартныя трохпакаёўкі агульнай плошчай да 70 «квадратаў» каштуюць да 100 тысяч долараў. Трохпакаёўкі ў дзевяціпавярховых дамах спальных раёнаў маюць самы распаўсюджаны цэннік ад 100 да 120 тысяч долараў.

Цяпер на другасным рынку сталічнага жылля ўзнікае новая тэндэнцыя сярод патэнцыяльных пакупнікоў, якія сталі больш увагі звяртаць менавіта на якасць рамонту жылля. З якасным рамонтам кватэры сёння прадаюцца значна лягчэй. Пакупнікі згодны даплочваць за рамонт да 5000 долараў, чым набываць «дабітую», але танную кватэру. Сёння займацца капітальным рамонтам у набытай жылой кватэры згаджаюцца толькі адзінкі пакупнікоў падобнага жылля.

### КАМЕРЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА ТАННЕЕ З ЛІСТАПАДА

Калі на другасным рынку сталічнай нерухомасці ўласнікі кватэр упарта працягваюць «трымацца» за леташні кошт і не спяшаюцца згаджацца на патанненне, то арганізатары будаўніцтва шматпавярховых дамоў вымушаны шукаць сур'ёзныя грошы менавіта ў патэнцыяльных кліентаў. Адсутнасць у насельніцтва магчымасці карыстацца не вельмі дарагімі крэдытнымі рэсурсамі банкаў прымусіла камерцыйных забудоўшчыкаў змяніць сваю цэнавую палітыку. Самае таннае жыллё гэтымі днямі прапануе кампанія «Тамбаз», дзе ў жылым комплексе па вуліцы Багдановіча квадратны метр шматпакаёвых кватэр каштуе ад 10 млн рублёў. У такой прапанове існуе толькі адзіны мінус — у эксплуатацыю дом будзе здадзены толькі ў апошнім квартале 2016 года. Калі падобныя жылыя дамы плануюць пабудаваць ужо сёлета, то кошт квадратнага метра павялічваецца да 12,5-14 мільёнаў рублёў. На першасным рынку жылля з'явіліся прапановы, па якіх квадратны метр агульнай плошчы каштуе ўжо 1250-1300 долараў. Праўда, па такім кошце выстаўляюцца толькі шматпакаёвыя кватэры вялікіх плошчаў. А вось тэрмін здачы дома — у другім ці трэцім кварталах наступнага года. Па лініі аднапакаёвых кватэр кошт жыллёвага «квадрата» на такіх умовах складае прыкладна 1500-1550 долараў.

Адзначу, што ў сегменце падобнага долевага будаўніцтва кліентам прапануюцца жыллёвыя метры без унутранай апрацоўкі. Відавочна, што пры такім раскладзе кліенты выбіраюць будаўніцтва новага жылля або толькі крыху даражэйшыя гатовыя кватэры ў жаданым раёне на другасным рынку. Нагадаю, што самы распаўсюджаны цэннік жыллёвага

> **Асобныя эксперты прагназуюць, што за час з мінулага лістапада да сёлетняга чэрвеня долевае камерцыйнае будаўніцтва павінна патаннець прыкладна на 15-20%.**

«квадрата» па сістэме долевага будаўніцтва да апошняга часу дасягаў 1550-1600 долараў. Аднак кліентаў на такое дарагое жыллё ў сталіцы ўжо не хапае, таму арганізатары будаўніцтва ўсё часцей вымушаны згаджацца зніжаць кошт або выдумляць розныя акцыі аб дзівосным патанненні пэўных катэгорый кватэр. Асобныя эксперты прагназуюць, што за час з мінулага лістапада да сёлетняга чэрвеня долевае камерцыйнае будаўніцтва павінна патаннець прыкладна на 15-20%.

### ЗАГАРАДНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ З НУЛЯВЫМ ПОПЫТАМ

Попыт на прыватныя дамы зімой заўсёды быў мінімальным. Для гэтага рынку снежань-люты ўвогуле лічыцца «мёртвым» сезонам. Аднак сёлета рынак такой жыллёвай нерухомасці спрабуюць актывізаваць прадаўцы. Спецыялісты адзначаюць істотнае павялічэнне прапановы ў Мінску і Мінскім раёне да 3,9 тысячы жылых дамоў і катэджаў. Яшчэ некалькі гадоў таму ў каталогу падобнай прапановы існавала толькі каля 1-1,2 тысячы жылых прыватных аб'ектаў. Апошнім часам гаспадары катэджаў спрабуюць прадаць сваё жыллё нават танней за сабекошт, а за атрыманыя грошы набываюць стандартныя кватэры ў шматпавярховіках.

### ДА ЧЭРВЕНЯ — МІНУС 10%

Рыэлтары мінскіх агенцтваў канстатуюць, што апошнія месяцы пакупнікі таргуюцца з уласнікамі кватэр за кожны рубель, бо прыходзяць на рынак толькі са сваімі грашыма. Пры адсутнасці танных крэдытаў пакупнікі памяншаюць свае апетыты і шукаюць бюджэтныя варыянты і невялікае па плошчы жыллё. Таму сёння найбольш таннеюць шматпакаёвыя кватэры і ўвогуле жыллё вялікіх плошчаў. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што такая тэндэнцыя захаваецца і надалей.

Разам з тым патэнцыяльныя пакупнікі вырашылі ўзяць тайм-аўт і пачакаць прымальных цэн і вялікай прапановы. Такая стратэгія часткова мае рацыю, бо людзей з вялікімі заробкамі больш не стала. Яшчэ адным з фактараў, які паўплывае на актыўнасць кліентаў, з'яўляецца праблема атрымання пазыковых грошай. Цяпер крэдыты менавіта пад набыццё жылля перасталі выдаваць насельніцтву не толькі дзяржаўныя, але і ўсе камерцыйныя банкі краіны. Таму наш эксперт упэўнены, што ў наступныя некалькі месяцаў цэннікі на жыллё будуць памяншацца, аднак абвалу кошту ў бліжэйшы час не будзе. Хутчэй за ўсё, гэта будзе павольнае зніжэнне, якое прывядзе да масавага патаннення стандартных кватэр мінімум на 10% к першым дням лета.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЦЭНЫ НА ЖКП БУДУЦЬ ЗАЛЕЖАЦЬ АД ЗАРПЛАТЫ

**Згодна з пастановай Савета Міністраў, якая ўступіла ў сілу 8 лютага, тарыфы на камунальныя паслугі, што субсідуюцца дзяржавай, будуць індэксавацца штоквартальна.**

Тарыфы будуць індэксаваць 1 сакавіка, 1 чэрвеня, 1 верасня і 1 снежня. Індэксы тарыфаў на ЖКП будуць вызначацца з улікам росту даходаў насельніцтва на падставе індэкса намінальнай налічанай заработнай платы за папярэдні квартал. Разлічваць гэты індэкс будзе Нацыянальны статыстычны камітэт, кіруючыся тэмпамі росту намінальнага налічанага заробку па краіне за справаздачны квартал у адносінах да папярэдняга.

Інакш кажучы, як нам патлумачылі ў Міністэрстве эканомікі, цэны на камунальныя паслугі будуць павышацца на такі ж працэнт, на які і сярэднямесячны заробак.

Індэксаваць тарыфы на паслугі па газа-, электра- і цеплазабеспячэнні будзе Савет Міністраў; па вывазе, абясшкоджванні і перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў — аблвыканкамы і Мінгарвыканкам; па тэхабслугоўванні жылых дамоў і водазабеспячэнні — аблвыканкамы і Мінгарвыканкам па ўзгадненні з Мінэканомікі.

Мяркуецца, што новаўвядзенне паспрыяе стабільнаму вызначэнню тарыфаў і зробіць немагчымым істотнае павышэнне цэн за ЖКП.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# АРЭАЛ TAX FREE Ў МІНСКУ ПАШЫРАЕЦЦА

**Гандлёвыя ўстановы сталіцы стануць больш прывабнымі для замежнікаў. У хуткім часе міжнародная сістэма Tax Free пашырыць свае межы за кошт сетак сталічных магазінаў Ziko, «Краўт», «Серж» і некаторых іншых, паведамляюць у Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Сёння Tax Free працуе ў дзесяці магазінах горада. Упершыню ёй пачалі карыстацца ў чатырох універмагах Мінска — ГУМе, ЦУМе, «Беларусі» і гандлёвым доме «На Нямізе». Напрыканцы мінулага года арэал Tax Free ў Беларусі пашырыўся: да яе далучыліся гандлёвы цэнтр «Кірмаш» і спецыялізаваныя магазіны оптыкі «Поры года» і «Венета». А ў ювелірнай краме «Чараўніца» дзень «народзінаў» Tax Free адзначылі ў першы ж дзень новага года. Бліжэйшым часам спіс устаноў, у якіх пасля набыцця пэўных пакупак замежнікі змогуць вярнуць падатак на дабаўленую вартасць (ПДВ), павінен значна павялічыцца. Для гэтага ўжо праведзена немалая падрыхтоўка. Акрамя дапрацоўкі праграмнага забеспячэння для касавых апаратаў, у выніку чаго сума падатку ў таварным чэку цяпер вылучаецца асобным радком, увесь персанал прайшоў адпаведную перападрыхтоўку

Дарэчы, за ўвесь час функцыянавання ў Беларусі сістэмы Tax Free замежнікі скарысталіся гэтай паслугай 253 разы, у Мінску — 237, аформіўшы чэкі на больш чым 500 млн рублёў. Магчымасць вярнуць ПДВ атрымалі замежныя госці з Аўстрыі, Германіі, Эстоніі, Кітая, Ізраіля, Латвіі, Украіны, Літвы, Італіі, Анголы, Кіпра, Азербайджана і іншых краін.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Оптоэлектронные системы»

| Лот № 1 | Здание административно-хозяйственное с инв. № 500/С-10550 | г. Минск, ул. Черняховского, д. 1 | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 7 920 960 000 | 396 048 000 | 5 |

Назначение – здание административно-хозяйственное, литер А 2/К. Год постройки – 1956. Площадь застройки/общая – 655 $м^2$/885,1 $м^2$. Этажей – 2. Фундамент – бутовый ленточный. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия чердачные, междуэтажные – деревянные. Крыша – шиферная, двухскатная. Полы – плитка, линолеум, дощатые. Проемы оконные – двойные деревянные. Проемы дверные – филенчатые. Наружная отделка цоколя – облицован силикатным кирпичом. Внутренняя отделка – окрашено, оштукатурено, облицовано плиткой, оклеено обоями. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка. Водопровод, горячее водоснабжение – стальные трубы. Канализация – чугунные трубы. Ванные (души) – душ. Вентиляция – вентканалы в стенах. Радио – ретрансляционная сеть. Телефон – каблирован. Составные части и принадлежности: пристройка (Ж1/к), пристройка (И1/к).
Дворовое покрытие – мелкозернистая асфальтобетонная смесь (186 $м^2$); площадка – мелкозернистая асфальтобетонная смесь с бордюрным камнем, 2 шт. (66 $м^2$ и 9 $м^2$); пешеходная дорожка – бетон (4 $м^2$); бордюр 0,14 – цементно-песчаный раствор (22,55 м.п.).

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания административно-хозяйственного.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Офисные помещения здания с инв. № 500/С-10550 сдаются в аренду: 19,3 $м^2$ по 31.05.2014; 21,8 $м^2$ по 31.12.2015; 23,4 $м^2$ по 31.12.2015; 28,3 $м^2$ по 31.12.2015; 63 $м^2$ по 31.12.2015; 19 $м^2$ по 31.12.2015; 79,9 $м^2$ по 31.05.2014; 31,3 $м^2$ по 31.12.2015; 58 $м^2$ по 31.12.2016; 80,6 $м^2$ по 31.05.2014; 30,1 $м^2$ по 30.04.2014; 38,7 $м^2$ по 31.12.2015; 10,1 $м^2$ по 31.01.2016; 22 $м^2$ по 31.05.2016.
Земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284 сдается по договору аренды ОАО «Оптоэлектронные системы» на срок по 28.02.2015.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: в охранной зоне линий связи и радиофикации, площадь 0,0184 га; охранной зоне линий электропередачи, площадь 0,0055 га; охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,0040 га.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Оплата стоимости приобретенного на аукционе Объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 20 000 000 руб. на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 20.03.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Оптоэлектронные системы», проводимом 20 марта 2014 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **18.03.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников **20.03.2014 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Рогожник Александр Николаевич 8 (029) 127-38-89.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Белинвестбанк»

| Лот | Объект | Адрес | Площадь | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Гараж с инв. № 500/D-636299 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 50 | 35,8 $м^2$ | 174 880 100 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Техническое состояние отличное. Расположен на 2-ом этаже здания с инв. № 500/С-33528 общей площадью 22023 $м^2$. Стены наружные – ж/б каркас, кирпичные. Стены внутренние, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Полы – бетонные. Проемы оконные – ПВХ. Проемы дверные – металлические. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. | | | | | |
| Лот № 2 | Гараж с инв. № 500/D-636300 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 51 | 37,2 $м^2$ | 181 734 500 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Техническое состояние отличное. Расположен на 2-ом этаже здания с инв. № 500/С-33528 общей площадью 22023 $м^2$. Стены наружные – ж/б каркас, кирпичные. Стены внутренние, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Полы – бетонные. Проемы оконные – ПВХ. Проемы дверные – металлические. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. | | | | | |
| Лот № 3 | Гараж с инв. № 500/D-636301 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 52 | 37,2 $м^2$ | 181 734 500 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Техническое состояние отличное. Расположен на 2-ом этаже здания с инв. № 500/С-33528 общей площадью 22023 $м^2$. Стены наружные – ж/б каркас, кирпичные. Стены внутренние, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Полы – бетонные. Проемы оконные – ПВХ. Проемы дверные – металлические. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. | | | | | |
| Лот № 4 | Гаражный бокс № 327 на 5-ом этаже гаражного блока с инв. № 500/D-637417 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 327 | 17,9 $м^2$ | 94 912 100 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Стены – ж/б. Перегородки – ПЦБ, кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Проемы оконные – деревянные одинарные. Проемы дверные – металлические. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 5 | Гаражный бокс № 331 на 5-ом этаже гаражного блока с инв. № 500/D-637421 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 331 | 18,5 $м^2$ | 98 339 300 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Стены – ж/б панели. Перегородки – ПЦБ, кирпичные. Перекрытия – ж/б. Полы – бетонные. Проемы оконные – деревянные одинарные. Проемы дверные – металлические. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 6 | Гаражный бокс № 547 на 7-ом этаже гаражного блока с инв. № 500/D-637739 | г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, пом. 547 | 21,8 $м^2$ | 102 908 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1999. Стены – ж/б панели. Перегородки – ПЦБ, кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Крыша – мягкая рулонная. Полы – бетонные. Проемы оконные – деревянные одинарные. Проемы дверные - металлические. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 7 | Гараж № 9 с подвалом в ГСК «Парк-14» с инв. № 500/D-1574 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 6, пом. 9 | 30,4 $м^2$ | 72 064 100 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1994. Фундамент – ж/б. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – цем. Подвал – ж/б. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 8 | Гараж № 18 с подвалом в ГСК «Парк-14» с инв. № 500/D-2179 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 6, пом. 18 | 33,7 $м^2$ | 80 060 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1990. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – бетонные. Смотровая яма – да. Подвал – бет. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 9 | Гараж № 19 с подвалом в ГСК «Парк-14» с инв. № 500/D-1582 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 6, пом. 19 | 33,7 $м^2$ | 80 060 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1990. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – бетонные. Смотровая яма – да. Подвал – бет. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 10 | Гараж № 20 с подвалом в ГСК «Парк-14» с инв. № 500/D-1583 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 6, пом. 20 | 33,7 $м^2$ | 80 060 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1990. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – бетонные. Смотровая яма – да. Подвал – бет. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 11 | Гараж № 21 с подвалом в ГСК «Парк-14» с инв. № 500/D-2180 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 6, пом. 21 | 33,7 $м^2$ | 80 060 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1990. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – бетонные. Смотровая яма – да. Подвал – бет. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 12 | Гараж № 31 с подвалом в ГСК «Центр-2» с инв. № 500/D-26777 | г. Минск, ул. Шаранговича, д. 11, пом. 31 | 31,8 $м^2$ | 75 491 300 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1994. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические ворота. Полы – бетонные. Смотровая яма – да. Подвал – бет. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 13 | Гараж № 260 в ГСК «Центр-2» с инв. № 500/D-26986 | г. Минск, ул. Шаранговича, д. 11, пом. 260 | 48,9 $м^2$ | 152 032 100 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1995. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Крыша – рулонная. Проемы – металлические ворота. Полы – бетонные. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 14 | Гараж № 266 в ГСК «Центр-2» с инв. № 500/D-26992 | г. Минск, ул. Шаранговича, д. 11, пом. 266 | 29,1 $м^2$ | 97 196 900 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1994. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – руб. Проемы – металлические. Полы – бетонные. Электроосвещение. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Лот № 15 | Гараж № 41б с подвалом и смотровой ямой в ГСК «Спектр-М» с инв. № 500/D-11611 | г. Минск, ул. Широкая, д. 37, пом. 41б | 29,7 $м^2$ | 64 067 300 | 15 000 000 |
| Год постройки – 1995. Фундамент – ж/б. Стены – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Полы – бетонные. Проемы дверные – металлические ворота. Смотровая яма – кирпичная. Электроосвещение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. Техническое состояние отличное. | | | | | |
| Обременение | Сдается по договору аренды на срок до 11.02.2015 с последующей пролонгацией. | | | | |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона и произвести оплату всей стоимости Объекта (Объектов) до передачи имущества, но не позднее 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 2 999 000 руб. по каждому лоту на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Шаг аукциона – 5%. Цель использования Объекта (Объектов) согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 18.03.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Белинвестбанк», **проводимом 18 марта 2014 г.**

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких Лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из Лотов.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **14.03.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников 18.03.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (объектами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): 8 (029) 377-48-01 Млечко Дмитрий Станиславович, 8 (029) 193-95-98 Юрий Николаевич (для осмотра Объекта, расположенного по адресу: ул. Широкая, 37).

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (Объекты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**

# Краіна здароўя

Выпуск № 2 (313)

■ Падаслаць саломкі

## АДМАЎЛЯЕЦЕСЯ АД ПРЫШЧЭПКІ? УЗВАЖЦЕ ЯШЧЭ РАЗ!

**Вы маеце права адмовіцца ад прышчэпак, але неапраўдана рызыкуеце. Вы падвяргаеце такім чынам небяспецы не толькі ўласнае жыццё, але і жыццё іншых людзей. Калі ваша дзіця не атрымала прышчэпкі, значыць, яго будучыня пад пагрозай. Такую пазіцыю займаюць медыкі.**

Паводле слоў **намесніцы галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірыны ХОДЗІНАЙ,** узбуджальнікі інфекцыйных захворванняў, якія пастаянна цыркулююць у папуляцыі, у першую чаргу пагражаюць непрышчэпленым людзям. Калі ўзбуджальніка «падхопіць» прышчэплены чалавек, ён значна лягчэй перанясе захворванне, без рызыкі лятальнага зыходу.

Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак — гэта нарматыўны прававы акт, які вызначае тэрміны і парадак правядзення прышчэпак. І права любога дзіцяці — быць абароненым ад хвароб. Сёння ў свеце прымяняюць вакцыны супраць 40 інфекцыйных захворванняў, а гэта азначае, што ад любой інфекцыі, супраць якой існуе вакцына, бацькі ў стане абараніць сваё дзіця. Менавіта таму ў кожнай краіне дзейнічае свой нацыянальны каляндар прышчэпак, куды ўключаны эфектыўныя і даступныя вакцыны супраць найбольш масавых і небяспечных інфекцый. У нашай краіне ўключаныя ў згаданы каляндар прышчэпкі робяцца бясплатна. На жаль, не ўсе бацькі валодаюць поўнай інфармацыяй, калі становяцца ахвярамі недаверу да прышчэпак.

**Коклюш**. Прыкладна ў аднаго з дзесяці дзяцей, якія захварэлі на коклюш, развіваецца запаленне лёгкіх, у аднаго з 50-ці ўзнікаюць сутаргі, у аднаго з 250-ці — энцэфалапатыя (паражэнне галаўнога мозга). Коклюш і яго ўскладненні могуць прывесці да гібелі.

**Дыфтэрыя**. 10-12 чалавек з 100 непрышчэпленых паміраюць. У выпадку выздараўлення часта маюць месца ўскладненні з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы, нырак і наднырачнікаў.

**Слупняк**. Таксін, які выпрацоўваецца ў арганізме пры траплянні ўзбуджальніка слупняку, валодае нервова-паралітычным дзеяннем. Практычна ў 100 працэнтах выпадкаў непрышчэпленыя гінуць.

**Поліяміэліт**. Захворванне выклікае вірус, які пашкоджвае нервовую сістэму і заканчваецца развіццём стойкіх парэзаў (парушэнняў руху) і паралічу (адсутнасці руху) або смяротным зыходам.

**Адзёр**. Асноўная прычына смерці сярод дзяцей ранняга ўзросту ва ўсім свеце.

**Туберкулёз**. Застаецца адной з вядучых прычын смерці ў свеце. Пашкоджвае не толькі лёгкія. Носьбітамі бацылы туберкулёзу лічаць кожнага трэцяга зямляніна.

***Бацькі, якія не прышчэпліваюць дзяцей, «прапаноўваюць» ім магчымасць:***

- ❍ з вялікай верагоднасцю стаць інвалідам пасля адру;
- ❍ да 2-х месяцаў пакутаваць ад кашлю, а магчыма і перанесці энцэфаліт пры коклюшы;
- ❍ мець 10-20-працэнтны шанц захварэць на дыфтэрыю;
- ❍ застацца калекам пасля поліяміэліту;
- ❍ быць безабаронным перад туберкулёзам, які не ведае межаў для распаўсюджвання;
- ❍ атрымаць бясплоднасць (у кожным чацвёртым выпадку для мужчын) пасля перанесенай «свінкі»;
- ❍ мець патрэбу ва ўвядзенні супрацьслупняковай сывараткі пасля кожнай траўмы, што звязана з верагоднасцю атрымання анафілактычнага шоку;
- ❍ стаць безабаронным перад гепатытам В з перспектывай цырозу і раку печані;
- ❍ вырасці і нарадзіць дзіця-інваліда з сіндромам прыроджанай краснухі.

■ Да ўвагі бацькоў

## ТО РЫНІТ, ТО БРАНХІТ...

**Дзеці, якія часта хварэюць, — гэта тыя дзеці, што часцей за «сярэднестатыстычных» пераносяць вострыя рэспіраторныя захворванні, не звязаныя з прыроджанымі або набытымі паталогіямі. У кожным канкрэтным выпадку для ўдакладнення прычын частых рэспіраторных інфекцый неабходна праводзіць дасканалы аналіз клінічных даных, вынікаў лабараторнага і інструментальнага даследаванняў. Найбольш частыя клінічныя формы: рыніт, назафарынгіт, ларынгатрахеіт, бранхіт, бронхапнеўманія, ЛОР-паталогія (атыт, сінусіт і інш.). Дзеці, якія часта хварэюць, адносяцца да 2-й групы здароўя, куды трапляюць пацыенты без хранічных захворванняў, але з функцыянальнымі, марфалагічнымі парушэннямі. Урач-рэабілітолаг 20-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Тамара ЖДАНОВІЧ тлумачыць падрабязнасці.**

### Што азначае «часта»?

Немаўляты — 4 і болей эпізодаў ВРІ за год
1-3 гады — 6 і болей
4-5 гадоў — 5 і болей
пасля 5 гадоў — 4 і болей.

### Што робіць дзіцячы арганізм такім успрымальным да ВРІ?

1. Неданошанасць, функцыянальная няспеласць, затрымка ўнутрывантробнага развіцця.
2. Пашкоджанне цэнтральнай нервовай сістэмы ў выніку гіпаксіі.
3. Парушэнне адаптацыі да розных фактараў знешняга асяроддзя, часта назіраюцца парушэнні тэрмарэгуляцыі.
4. Дыятэзы (праяўленне генетычнай схільнасці да разнастайных паталагічных рэакцый на звычайныя раздражняльнікі).
5. Хранічная інфекцыя ў носа- і ротаглотцы.
6. Нізкі ўзровень санітарнай культуры, неспрыяльныя бытавыя ўмовы.
7. Ранні пачатак наведвання дзіцячай дашкольнай установы (1-1,5 года).
8. Пражыванне ў сем'ях з вялікай колькасцю дарослых або проста сярод вялікай колькасці людзей (у інтэрнаце, вялікіх камунальных кватэрах).
9. Нерацыянальнае харчаванне (лішак вугляводаў, дэфіцыт бялку, вітамінаў, мікраэлементаў).
10. Экалогія.

### Тры асноўныя тыпы дзяцей, якія сапраўды часта хварэюць

— вострыя захворванні да 8 і больш разоў на працягу года, выяўленая інтаксікацыя, высокая тэмпература, ваніты, працяглы кашаль, ускладненні — бранхіт, пнеўманія;
— захворванні 4-6 разоў за год, схільнасць да працяглага рыніту, адэноіды, павелічэнне лімфавузлоў, ускладненні — атыт, сінусіт;
— змешаны тып.

### Тэрапія

Супрацьвірусная, антрыбактэрыяльная; выкарыстоўваюцца гарачкапаніжальныя, супрацькашлевыя, назальныя сасудазвужальныя.

### Як умацаваць здароўе?

❒ Мінімум стрэсаў!

У групе дзяцей, пра якіх ідзе размова, часта маюць месца парушэнні з боку цэнтральнай нервовай сістэмы і вегетатыўнай нервовай сістэмы. Таму неабходна рабіць так, каб дзіця пазбягала павышаных нагрузак, у тым ліку эмацыйных: абмяжоўваць прагляд тэлевізара, гульні на камп'ютары. Дзённы сон абавязковы. Начны падоўжаны на 1-1,5 гадзіны. Пры расстройстве сну, магчыма, варта параіцца з неўролагам наконт седатыўных прэпаратаў. Прагулкі на свежым паветры.

❒ Знешняе асяроддзе.

Члены сям'і абавязаны ізаляваць хворага, насіць маскі, пажадана не карыстацца грамадскім транспартам па дарозе да дзіцячага садка, не курыць, рэгулярна праветрываць жыллёвае памяшканне. У дамах з цэнтральным ацяпленнем у зімовы перыяд назіраецца нізкая вільготнасць паветра, што прыводзіць да падсыхання слізістых носа падчас сну. Таму для скарачэння ўспрымальнасці дзяцей да вірусных інфекцый рэкамендуецца закапваць фізіялагічны раствор 1-2 разы на дзень.

❒ Цеплавы рэжым.

Аптымальная тэмпература паветра ў памяшканні — 18-20 градусаў удзень і на 2-4 градусы ніжэйшая ноччу. Паступовa трэба прывучаць дзіця да знаходжання ў пакоі падчас праветрывання. Адзенне павінна адпавядаць тэмпературы паветра і так званай сістэме «1, 2, 3»: летам — адзін слой, вясной і восенню — два, зімой — тры. Першы слой павінен быць з бавоўны або льну.

❒ Рацыянальнае харчаванне.

Абавязкова даваць агародніну, садавіну, кісла-малочныя прадукты, арэхі, семкі, гарбуз, белакачанную капусту, тлустую рыбу, натуральныя антыаксіданты (напрыклад, мандарыны, моркву, слівы, вінаград, цыкорый), ялавічны язык, курыную грудку, авёс, грэчку, проса, талакно, пятрушку. У выпадку харчовай алергіі рэкамендуецца індывідуальная гіпаалергенная дыета.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

❒ Загартоўванне.

Яно неабходнае для трэніроўкі сістэмы тэрмарэгуляцыі арганізма. У загартаваных дзяцей падчас ахалоджвання тэмпература ў поласці носа зніжаецца ўсяго на 0,3-0,5 градуса, што не парушае функцыі ахоўных клетак. Для загартоўвання ў такіх дзяцей не выкарыстоўваюцца вельмі нізкія тэмпературы. Уздзеянне холадам — 10-20 хвілін. Важна: займацца загартоўкай трэба рэгулярна, паступовa павялічваць нагрузку.

**З першых тыдняў жыцця** дзіця пакідаюць раздзетым на некалькі хвілін пры тэмпературы 22 градусы (у 2-3 месяцы — 20 градусаў, 4-6 месяцаў — 18) падчас спавівання, гімнастыкі, перад купаннем. Пасля купання 2-3 разы на тыдзень дзіця абліваюць вадой на 2-4 градусы халаднейшай, чым вада ў ванне (кожныя тры дні можна зніжаць тэмпературу вады на 2-3 градусы). Праз месяц тэмпература вады павінна складаць 20-24 градусы. Пасля аблівання трэба добра расцерці цела ручніком. Методыка не рэкамендуецца дзецям з неўралагічнай паталогіяй.

У 2 гады штодня дзіцяці мыюць ногі халаднаватай вадой (паступова, праз кожныя 1-3 дні, паніжаюць тэмпературу вады на 2-3 градусы з 27 да 16 градусаў). Кантрасны душ: 30-40 секундаў вада да 40 градусаў, 15-30 секундаў — 15 градусаў.

Для дашкольнікаў можна арганізаваць паветраныя ванны. У пакоі, дзе спіць дзіця, адчыняем фрамугу і паніжаем тэмпературу паветра да 15 градусаў, будзім дзіця і прымушаем зрабіць некалькі прабежак з халоднага пакоя ў цёплы і назад.

**Мясцовая загартоўка.** Мыць твар, рукі, за вушамі халоднай вадой, паласкаць горла вадой пакаёвай тэмпературы. Можна рабіць некалькі разоў на дзень без перапынку. Рэкамендуецца таксама гімнастыка, масаж твару, правільнае насавое дыханне. Пасля няцяжкага рэспіраторнага захворвання загартоўку можна аднавіць праз 7-10 дзён, пасля захворвання з тэмпературай больш за 4 дні — праз 2 тыдні.

❒ Вітаміны.

Мультывітамінныя прэпараты рэкамендуюцца ў час здароўя паміж захворваннямі, а таксама пры слабым апетыце, незбалансаваным харчаванні, хранічных хваробах органаў стрававання.

❒ Карэкцыя імунітэту.

Спецыяльная тэрапія для ўздзеяння на імунныя працэсы (сістэму інтэрферону, клетачны імунітэт і інш.) падбіраецца ўрачом.

❒ Карэкцыя дысбактэрыёзу.

Для аднаўлення мікрафлоры кішэчніка выкарыстоўваюць прэ- і прабіётыкі.

❒ Вакцынацыя.

Супраць грыпу А і В, гемафільнай палачкі, пнеўмакока — важная справа ў прафілактыцы ВРІ.

❒ Санацыя хранічных ачагоў інфекцыі.

Асабліва паказана дзецям з гіпертрафіяй паднябенных міндалін, адэноідамі, хранічнымі захворваннямі розных органаў.

Двойчы на год рэкамендуецца дэгельментызацыя. ■

■ Трэба праверыць!

## МОЖА НЕРВЫ, А МОЖА БЫЦЬ, І ЗАЛОЗА



**Сталёвыя нервы — мара кожнага. Аднак здараецца, што нервы падводзяць, і мы нават не здагадваемся, што слабасць нашай нервовай сістэмы абумоўлена збоямі ў рабоце шчытападобнай залозы, адзначае загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення медыка-санітарнай часці ЗАТ «Атлант» Аксана САНЕЦ.**

### Чым кіруе?

Гэты невялікі орган, размешчаны на пярэдняй паверхні шыі, складаецца з дзвюх доляў, злучаных паміж сабой перашыйкам. Нягледзячы на невялікі памер, шчытападобная залоза падпарадкавала сабе практычна ўсе працэсы ў арганізме. Яна актыўна ўдзельнічае ў абмене рэчываў, выкідвае ў кроў гармоны, ад лішку ці недахопу якіх пакутуюць практычна ўсе ўнутраныя органы, аб чым і паведамляе нам наша нервовая сістэма. Развіццё малочных залоз, стан скуры і валасоў, здольнасць вынасіць і нарадзіць здаровае дзіця, разумовыя здольнасці, сон і апетыт, фізічная актыўнасць, маса цела, трываласць касцей, работа сэрца, імунітэту, развіццё механізмаў старэння — усё гэта ў многім залежыць ад «шчытавідкі».

### У жанчын так

Раздражнёнасць, плаксівасць, парушэнне сну, нервознасць, змяненне апетыту і вагі часта звязваюць з нервовым знясіленнем або дэпрэсіяй. Звычайныя заспакаяльныя сродкі, адпачынак і змена абстаноўкі аказваюць часовы эфект, а пасля праблема вяртаецца з падвоенай сілай. Дрэннае самаадчуванне можа быць выклікана:

— дэфіцытам гармонаў шчытападобнай залозы — гіпатырэёзам,

— лішкам гармонаў — тырэатаксікозам,

— сімптомамі сціскання органаў шыі павялічанай шчытападобнай залозай — валляком.

Кожная жанчына павінна разумець, што работа жаночага арганізма падпарадкавана сваім асаблівым біярытмам: «крытычным» дням, цяжарнасці, родам, грудному кармленню, клімаксу — усе гэтыя працэсы ўплываюць на работу шчытападобнай залозы і робяць жанчын схільнымі да перападаў настрою, неўрозаў і дэпрэсіі. У мужчын гэтая залоза больш «паслухмяная» і радзей дае збоі, паколькі ў мужчынскім арганізме ўсе ўнутраныя органы працуюць паводле стабільнага графіка.

### Што ўплывае?

У 50-60 працэнтах выпадкаў паталогія шчытападобнай залозы з'яўляецца спадчынным захворваннем. Перадаецца менавіта схільнасць да захворвання, а праявіцца яно ці не — залежыць ад знешніх фактараў.

❍ Недахоп або лішак ёду. Ёд неабходны для нармальнай выпрацоўкі гармонаў.

❍ Празмернае знаходжанне на сонцы, уздзеянне радыяцыі.

❍ «Аўтаімунная вайна». Да паталогіі можа прывесці ўласная імунная сістэма. У норме яна вынішчае чужародныя і змененыя клеткі ў арганізме. Але часам арганізм пачынае ўспрымаць уласную «шчытавідку» як нешта чужароднае і выпрацоўвае антыцелы да яе тканак, якія або паступовa разбураюць залозу, або прымушаюць выпрацоўваць неверагодную колькасць гармонаў.

❍ Вірусныя і бактэрыяльныя інфекцыі.

❍ Ферментная паталогія, няправільнае развіццё органа.

❍ Дабраякасныя і злаякасныя новаўтварэнні.

### У вас ёсць такія сімптомы?

**ГІПАТЫРЭЁЗ**. Поўная страта жыццёвай энергіі. Запавольваюцца абменныя працэсы, з'яўляюцца слабасць, зніжэнне памяці і працаздольнасці, санлівасць удзень, затармажанасць, запавольванне маўлення, дрэнны настрой, прыбаўка вагі, ацёчнасць, сухасць скуры, выпадзенне валасоў, ломкасць пазногцяў, рэдкі пульс, парушэнне артэрыяльнага ціску. Месячныя становяцца рэдкімі, рана надыходзіць менапаўза. Такім жанчынам цяжэй зацяжарыць, часта недахоп гармонаў шчытападобнай залозы прыводзіць да невыношвання цяжарнасці.

**ТЫРЭАТАКСІКОЗ**. Абмен рэчываў рэзка паскараецца, зніжаецца вага, з'яўляюцца пачашчанае сэрцабіццё, пачуццё гарачкі, непераноснасць высокіх тэмператур, дрыжанне рук і цела, мышачная і агульная слабасць, частыя змены настрою, агрэсіўнасць, эмацыйнасць, плаксівасць, немагчымасць сканцэнтравацца на выкананні задачы, пачуццё страху, бяссонніца.

**ЭКЗАФТАЛЬМ**. Аўтаімуннае захворванне шчытападобнай залозы прыводзіць да вірлавокасці.

**ВАЛЛЯК**, або вузел. Патаўшчэнні, прыпухласці ў месцы шчытападобнай залозы могуць узнікаць пры любым стане залозы і заўсёды патрабуюць лячэння. Для дакладнага выяўлення памераў і аб'ёму залозы, наяўнасці вузлоў і кістаў праводзяць ультрагукавое даследаванне. Часта вузлавы валляк з'яўляецца выпадковай знаходкай, выяўленай падчас прафілактычнага абследавання, бо вузлавыя ўтварэнні не суправаджаюцца болем. Небяспека ж валляку ў тым, што хвароба прагрэсуе, і да аднаго вузла дадаюцца іншыя, а можа пачацца і злаякаснае перараджэнне. Акрамя таго, некаторыя вузлы выкідваюць у кроў лішак гармонаў.

■ Псіхалагічная падтрымка

## ПОБАЧ — ХВОРЫ НА ДЭПРЭСІЮ

### Што і як рабіць блізкім у падобнай сітуацыі?

**Блізкія чалавека, які знаходзіцца ў дэпрэсіі, часта спрабуюць «натхніць» хворага — раяць узяць сябе ў рукі, сабрацца, змяншаюць сур'ёзнасць сітуацыі: маўляў, не так усё і дрэнна, варта проста перачакаць, а пакуль проста чым-небудзь заняцца. Насамрэч яны проста не разумеюць, што ў хворага на дэпрэсію няма жаданняў і волі, ён не здольны жадаць! А таму і пералічаныя заклікі — па-першае, бессэнсоўныя, а па-другое — шкодныя, паколькі хворы можа адчуць, што яго не разумеюць і не прымаюць усур'ёз, раз ён не здольны адгукнуцца на іх заклікі.**

— Паводзіны чалавека, які знаходзіцца ў стане дэпрэсіі, не падобныя да яго звычайных, прыватных паводзін, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт, загадчыца аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Вольга ПРАКОП'ЕВА.** — Размова ідзе пра хваравітыя паводзіны, якія трэба ўсвядоміць і прыняць. Самая важная задача блізкіх — матываваць хворага звярнуцца да ўрача. Неабходна пераканаць яго, што хвароба, якая ляжыць у аснове яго паводзін, сёння добра вылечваецца, а значыць, лячэнне можа пазбавіць пакут. Тое ж самае датычыцца і тых хворых, якія пакутуюць ад страху, праяўляюць празмерную занепакоенасць. Такія людзі схільныя да суіцыду.

Фармакатэрапія мае на ўвазе рэгулярны прыём лекаў даволі працяглы час. Заўчаснае спыненне прыёму антыдэпрэсантаў прыводзіць да вяртання хваробы, асабліва ў тых выпадках, калі чалавек раней перанёс некалькі хваляў дэпрэсіі.

**Правілы паводзін сваякоў і сяброў хворага на дэпрэсію:**

1. Хворы павінен адчуваць добразычлівасць, аднак празмерная апека, абмежаванне свабоды не патрабуецца.
2. Неабходна адн준часова падтрымліваць блізкія стасункі і вытрымліваць пэўную дыстанцыю.
3. Цярпенне і яшчэ раз цярпенне.
4. Жаданні і пачуцці трэба выказваць прама, не спрачацца з хворым.
5. Варта падтрымліваць яго жаданне працягваць лячэнне, але не дэманстраваць паказальны, няшчыры аптымізм.
6. Любы прагрэс у лячэнні трэба ацэньваць станоўча і хваліць за яго.
7. Разам з хворым можна планаваць яго дзень і размяркоўваць справы.
8. Трэба кантраляваць уласны стан, каб папярэдзіць «заражэнне» настроем хворага.

Сёння шмат кажуць пра дадатковыя спосабы пераадолення дэпрэсіі — з дапамогай спорту і фізкультуры. Такое будзе магчымым толькі тады, калі хворы ўжо прайшоў сур'ёзны шлях да выздараўлення. Гэта можа дапамагчы папярэдзіць наступленне дэпрэсіі ў будучыні.

Хвораму можа быць лягчэй далучыцца да заняткаў, калі ён пачне іх не ў адзіночку. Такая фізічная дзейнасць будзе вырываць з кола негатыўных думак. Даследаванні даказалі: фізічная актыўнасць аказвае антыдэпрэсіўнае дзеянне, добра ўплывае на душэўны стан.

Пытанні дыеты не лічацца надта істотнымі. Хоць мяркуецца, што недахоп тлустых кіслот амега-3 (знаходзяцца ў тлустай марской рыбе) стварае рызыку для захворвання на дэпрэсію. Звяртаецца ўвага і на ролю вітамінаў групы В.

Распарадак дня павінен уключаць толькі тое, з чым хворы можа справіцца. Калі ён не справіцца з намечаным, гэта можа быць крокам да расчаравання і крокам назад, да дэпрэсіі.

Хвораму варта параіць весці дзённік, куды запісваць свае адчуванні, сны. Можна займацца і жывапісам, слухаць любімую музыку.

Большасць людзей, якія перанеслі дэпрэсію, схільныя перажываць яе пасля зноў, калі не атрымліваюць ніякага лячэння — лекавых прэпаратаў і псіхатэрапіі. Суадносіны гэтых метадаў залежаць ад канкрэтнага выпадку захворвання.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Інфарм-укол

## Чаму баліць жывот?



**Гэта можа быць адно з запаленчых захворванняў органаў брушной поласці:**
**— востры апендыцыт (запаленне адростка сляпой кішкі)**
**— востры халецыстыт (запаленне жоўцевага пузыра)**
**— востры панкрэатыт (запаленне падстраўнікавай залозы)**
**— язва страўніка і 12-перснай кішкі.**

***Загадчык хірургічнага аддзялення 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Віктар ШВЕДАЎ*** тлумачыць падрабязней.

### Апендыцыт

Патрабуе неадкладнай медапамогі — аператыўнага выдалення адростка сляпой кішкі (участак тоўстага кішэчніка). Іначай адростак можа разарвацца, і гной трапіць у брушную поласць.

Першая прыкмета такога запалення — тупы боль каля пупка, уверсе жывата. Падчас руху боль заяўляе аб сабе ў ніжняй частцы жывата справа. Акрамя таго: страта апетыту, млосць, ваніты, успушванне жывата, павышэнне тэмпературы цела да 37-38 градусаў.

Да прыезду ўрача нельга прымаць ежу і піццё. Забароненыя любыя болесуцішальныя, паслабляльныя сродкі, а таксама саграванне балючага ўчастка, што можа ўзмацніць запаленне. Можна скарыстацца толькі пузыром з лёдам або халоднай вадой.

### Халецыстыт

Для запалення жоўцевага пузыра характэрнае парушэнне руху, адтоку жоўці. Амаль у 95 працэнтах выпадкаў развіццё вострага халецыстыту звязана з камянямі. Жоўцекамянёвая хвароба — гэта калі ў жоўцевым пузыры ў выніку застою жоўці ўтвараюцца камяні, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце жоўцевых шляхоў. Пры шматразовым паўторы вострых прыступаў вядуць размову аб хранічным халецыстыце.

Боль узнікае пасля ўжывання ежы (асабліва вострай і тлустай), алкаголю, моцнага стрэсу, працяглай паездкі ці пераносу цяжару. Жоўцевая коліка — востры боль у правым падрабрынні, верхняй частцы жывата. Боль можа аддаваць у спіну, пад правую лапатку, радзей у левы бок. Хворага можа і ванітаваць, можа і крыху ўзняцца тэмпература. Сімптомы жоўцекамянёвай хваробы часам падобныя на боль у грудзях, які ўзнікае падчас сардэчнага прыступу.

Пры гэтым стане таксама трэба выклікаць урача. Хвораму неабходна забяспечыць пасцельны рэжым, нельга есці.

Прафілактыка вострага халецыстыту заключаецца ў здаровым харчаванні, абмежаванні алкаголю і вострай і тлустай ежы. Вітаецца фізічная актыўнасць, паколькі гіпадынамія спрыяе застою жоўці і ўтварэнню камянёў. Ужываць ежу трэба не радзей як раз на 4 гадзіны. Абавязкова не менш за 1,5 л вады. Нельга пераядаць на ноч.

Такім хворым забараняюць яечныя жаўткі, сырую агародніну і садавіну, здобу, масла, арэхі, марожанае. Падчас абвастрэння рэкамендуюцца свежапрыгатаваныя на пары або вараныя прадукты ў цёплым выглядзе. Па-за абвастрэннем можна ўжываць курагу, разынкі, чарнасліў, моркву, кавун, дыню. Гэтыя прадукты нармалізуюць маторыку жоўцевага пузыра і пазбаўляюць запораў.

### Панкрэатыт

У падстраўнікавай залозы, якая размяшчаецца ніжэй і крыху за страўнікам, побач з 12-перснай кішкай, — дзве асноўныя функцыі: яна ўтварае стрававальныя ферменты, якія «перадае» тонкаму кішэчніку для пераправульвання бялкоў, тлушчаў і вугляводаў, і ўтварае і выдзяляе ў кроў такія гармоны, як інсулін і глюкагон (без іх немагчымы метабалізм глюкозы).

Запаленне можа ўзнікаць раптоўна. У большасці выпадкаў прыступ абумоўлены або закупоркай жоўцевых шляхоў каменем, або злоўжываннем алкаголем. Падстраўнікавая залоза асабліва адчувальная да згубнага ўздзеяння алкагольных напояў, з чым звязана самая цяжкая форма панкрэатыту — панкрэанекроз.

Моцны ныючы боль у верхняй частцы жывата (аддае ў паясніцу і лапатку), распаўсюджваецца па ўсім жываце, з'яўляецца млосць і ваніты, вусны сінеюць, пульс пачашчаецца, тэмпература можа і не павышацца. Абвастрэнне можа ўзнікнуць пасля любога парушэння дыеты.

Хворага неабходна накіраваць у бальніцу, дзе будзе прызначана лячэнне — лекі або аперацыя (у залежнасці ад змен у залозе). Да прыезду ўрача хвораму нельга ні есці, ні піць.

### Язва страўніка і 12-перснай кішкі

Смыленне, боль, які нагадвае пачуццё вострага голаду, з'яўляецца паміж пупком і грудзінай, часам аддае ў спіну. Гэта можа цягнуцца некалькі хвілін, а можа і некалькі гадзін (і знікаць пасля прыёму прэпаратаў, якія зніжаюць кіслотнасць, дэзактывуюць саляную кіслату). Болевыя адчуванні могуць цягнуцца адзін-два тыдні і змяняцца перыядамі без болю. Акрамя таго — зніжэнне апетыту, страта вагі, успушванне жывата, млосць або ваніты пасля яды.

Сімптомы язваў страўніка і 12-перснай кішкі аднолькавыя, праявы хваробы адрозніваюцца толькі часам узнікнення. Пры язвах страўніка боль узнікае адразу пасля ежы (калі ежа трапляе ў страўнік), а пры язве 12-перснай кішкі праяўляецца праз некалькі гадзін пасля ежы (калі страўнік пусты) і можа ўзмацняцца пасля новага прыёму ежы. Часта хворыя скардзяцца на боль у жываце ноччу.

**УСКЛАДНЕННІ ЯЗВЫ:**

❒ прабадзенне (разрыў сценкі страўніка ў месцы язвы)

Рэзкі боль у жываце («кінжальны» боль), бледнасць, халодны пот, сценка жывата напружаная і шчыльная, як дошка. Хворы звычайна ляжыць на баку і прыціскае сагнутыя ў каленях ногі да жывата. Мінімальны рух узмацняе боль.

❒ крывацёк

Слабасць, патлівасць, бледнасць, часты пульс, нізкі артэрыяльны ціск, часам страта прытомнасці. Ваніты з крывёй, «кававага» колеру, чорны стул.

Пры такіх сітуацыях «хуткую» трэба выклікаць тэрмінова. З моманту ўзнікнення сімптомаў нельга даваць хвораму ежу, піццё, любыя лекі. Нельга праводзіць ачышчальныя працэдуры (клізмы, піццё з выкліканнем ванітаў). Нельга грэцца ў гарачай ванне, прыкладаць грэлку. ■

# «Так захапілася Шагалам, што затапіла суседзяў...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Пра гарэлку «Шагал», «Мёртвыя душы» і віцебскі хлеб

**З унучкай мастака** я пазнаёмілася, калі яшчэ не была дырэктаркай музея. У 1997 годзе нашчадкі ладзілі першую выставу Шагала ў Беларусі. Прывезлі яго карціны ажно з Ніцы. Я тады працавала на выставе экскурсаводам. Людзей, якія хацелі пазнаёміцца з творчасцю мастака, было вельмі шмат. Мы працавалі без выхадных, вельмі стаміліся. Таму, калі мяне выклікала кіраўніца віцебскага мастацкага музея і сказала, што заўтра прыедзе ўнучка Шагала са Швейцарыі, і я мушу правесці ёй экскурсію па горадзе, я была вельмі не задаволена. Цяпер жа дзякую лёсу, бо тое наша знаёмства з Мэрэт Мэйер-Грабер перарасло ў сапраўднае сяброўства.

**Раней імя Шагала** эксплуатавалі ў Беларусі направа і налева без дазволу нашчадкаў. Унучкі Шагала былі ў шоку, калі даведаліся, што ў Мінску пачалі выпускаць гарэлку «Шагал». Падалі іск у суд. У судзе вытворцы павялі сябе некарэктна. Спачатку даказвалі, што «гэта не той Шагал, пра якога вы думаеце». У той час, калі на бутэльцы быў партрэт Шагала з датамі жыцця і відамі Віцебска! Потым пачалі казаць: «Можа, гэта і той Шагал, але пра яго ў Беларусі ніхто не ведае». Мы, вядома, выступалі на баку ўнучак Шагала, якія ўрэшце выйгралі той працяглы судовы працэс.

**Мы імкнёмся** не толькі самі не парушаць аўтарскае права, але і не дапускаць, каб гэта рабілі беларускія прадпрымальнікі. Калі віцебскі хлебакамбінат стаў выпускаць хлеб «Шагалаўскі», мы іх папярэдзілі, што гэта парушэнне аўтарскіх правоў. Яны тут жа адрэагавалі; знялі гэтую назву. Перад тым, як выдаць ілюстрацыі Шагала да паэмы Гогаля «Мёртвыя душы», Мінская фабрыка дзяржзнака атрымала дазвол у Парыжы. І гэты цывілізаваны крок пад сілу зрабіць кожнаму прадпрыемству.

**Віцебскі хлеб**, дарэчы, вельмі смачны. Раней, калі нехта ехаў у Прыбалтыку і пытаўся, што адтуль прывезці, мы з калегамі замаўлялі менавіта хлеб. Цяпер жа і ў нас вырабляюць не горшы. А вось «утылізацыя» імя мастака, паэта, музыкі — дрэнная рэч. З гэтым трэба змагацца. Калі я бачу ў інтэрнэце, што ў Маскве вырабляюць масажны стол «Шагал», ці заходжу ў рэстаран, а там у меню свіная катлета «Шагал», — то гэта за межамі майго разумення.

**Не трэба «забіваць клішэ» ў галаву дзіцяці, не трэба зашорваць яму свядомасць ні Шагалам, ні Малевічам, ні Савіцкім. Дайце магчымасць нарадзіцца творчаму пачатку!**

## Пра Мікалая Дабранравава, Алу Пугачову і калекцыю анёлаў

**З усіх удзельнікаў «Славянскага базару»** добра калі 3-4 зоркі знойдуць час завітаць да Шагала. Памятаю вельмі прыемны дыялог з Аляксандрай Пахмутавай і Мікалаем Дабранрававым, якія прыйшлі ў музей за некалькі гадзін да адлёту. У нас якраз экспанаваліся ілюстрацыі Шагала да «Мёртвых душ». Ніколі не забуду, як паэт тут жа, гледзячы на працы Шагала, пачаў цытаваць Гогаля. А оперная спявачка Любоў Казарноўская не ведала, што ў нас два будынкі. Перад выступленнем



паспела паглядзець толькі Дом-музей на Пакроўскай. Але ёй так там спадабалася, што на наступны дзень знайшла час і прыйшла ў Арт-цэнтр Марка Шагала. Ні разу не была ў нас Ала Барысаўна Пугачова, хоць яна шмат гадоў узначальвала журы фестывалю.

**Тое, што карціны выносяцца** на вуліцу (гаворка ідзе пра выстаўку рэпрадукцый карцін Марка Шагала, якая прайшла пад адкрытым небам у Мінску з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння мастака) — добрая справа. Гэта своеасаблівы спосаб папулярызацыі творчасці мастака. Чалавек, далёкі ад мастацтва, можа ніколі не прыйсці ў музей. А тут вяртаецца ён з працы праз плошчу Якуба Коласа і, хочаш не хочаш, судакранаецца з мастацтвам. 100 чалавек пройдзе міма, а 101-ы — глядзіш і зацікавіцца.

**Адмоўна стаўлюся** да ўсіх пленэраў «а ля Шагал». Таксама я супраць усялякіх конкурсаў дзіцячага малюнка па матывах творчасці Шагала. Не трэба «забіваць клішэ» ў галаву дзіцяці, не трэба зашорваць яму свядомасць ні Шагалам, ні Малевічам, ні Савіцкім. Дайце магчымасць нарадзіцца творчаму пачатку! Вось гляньце, якіх аўтэнтычных анёлкаў *(паказвае малюнкі)* зрабілі дзеткі з Германіі. Прычым самаму маленькаму аўтару 4 гады. Гэта рэшткі маёй калекцыі анёлкаў. Я імі вельмі даражу.

**Калісьці мела неасцярожнасць** пачаць збіраць анёлаў. Мне пачалі іх прыносіць з усіх гарадоў і вёсак. Ёсць у мяне нават цёмнаскуры анёлак з Афрыкі *(усміхаецца)*. Але, як, пэўна, кожны калекцыянер, я сутыкнулася з праблемай: чалавек прыносіць нешта ў падарунак ад усёй душы, а мне не падабаецца, бо гэта кіч. Прыйшоў дзень, калі ў мяне ўжо не было не тое што месца, але і жадання збіраць іх далей.

**Карціны Шагала** каштуюць вельмі дорага. Таму спадзявацца на тое, што ў Віцебску ў бліжэйшы час з'явіцца калекцыя жывапісных работ славутага земляка, не прыходзіцца. У той час, калі Шагал быў яшчэ жывы, мы ўпусцілі шанц. Перакананa, што, калі б ён даведаўся, што на радзіме з'явіўся музей Шагала, то можна было спадзявацца на нейкую калекцыю, якую мастак мог перадаць у родны горад. Бо Віцебск быў для яго магічным словам.

**Калі я бачу ў інтэрнэце, што ў Маскве вырабляюць масажны стол «Шагал», ці заходжу ў рэстаран, а там у меню свіная катлета «Шагал», то гэта за межамі майго разумення.**

**Шагал** — мастак з Беларусі, і пра гэта цяпер ведаюць усё шырэй. Калі яшчэ нядаўна ў выставачных каталогах на Захадзе пісалі: «Шагал нарадзіўся ў Віцебску, у Расіі», то цяпер такой памылкі не робяць. Прыйшло разуменне таго, што культура Беларусі — зусім іншая культура.

**Жывучы ў эміграцыі,** Шагал (які быў грамадзянінам Францыі, а на працягу ўсяго свайго жыцця размаўляў і пісаў на ідыш) іншым разам (досыць рэдка) называў сябе і расійскім мастаком, хоць розных нацыянальных вызначэнняў у мастацтве вельмі не любіў. Справа, напэўна, у тым, наколькі актыўна тая ці іншая краіна прысвойвае набыткі, якія яна атрымлівае ад іншых культур — а на сінтэзе культур сёння трымаецца свет. Нашай краіне трэба гучней заяўляць пра тое, што Шагал — з Беларусі.

## Пра музу, лахматага мастака і селядцы

**Біяграфія Шагала** да эміграцыі была амаль не вядома. Я падумала: напэўна, захаваліся нейкія дакументы, акрамя аўтабіяграфіі «Маё жыццё», якую ён сам і напісаў. І пачала шукаць. Калі раней біяграфію Шагала пісалі на 100 старонках і пра першыя 33 гады жыцця мастака там было 5 старонак, то цяпер мы можам распісаць жыццё Шагала калі не па хвілінах, то па гадах.

### БЛІЦ-АПЫТАННЕ

***— Ці часта слухаеце музыку і якую? Што вам падабаецца і што не?***

— Шмат часу на музыку не маю, але люблю слухаць класіку, оперныя партыі. З песнямі Акуджавы і Камбуравай адпачываю душой, маю іх альбомы ў сваім мабільніку.

***— Ваш любімы гістарычны персанаж?***

— Цяжка сказаць. Я гісторык па адукацыі, люблю дакопвацца да дробязяў. Здараецца, захопішся якім-небудзь персанажам, а залезеш глыбей — ёсць пытанні...

***— Якой стыхіі вы належаце: вада, паветра, агонь, зямля?***

— Па знаку задыяка я — Шалі. Таму заўсёды вагаюся паміж рознымі стыхіямі.

***— Месцы ў свеце, з якімі звязаныя цёплыя ўспаміны?***

— Тыя, дзе я была з любімымі людзьмі. Месца на геаграфічнай карце ў такім выпадку прынцыповага значэння не мае.

***— Якія якасці вы больш за ўсё цэніце ў мужчыну?***

— Здольнасць браць на сябе адказнасць, здольнасць да суперажывання.

***— Здольнасць, якой вам хацелася б валодаць?***

— Свабодна размаўляць на еўрапейскіх мовах.

***— Чым са здзейсненага ў жыцці, вы ганарыцеся?***

— Тым, што разам з калегамі мы зрабілі за апошнія гады з Музеем Марка Шагала.

**Летась** выйшла мая кніга «Марк Шагал і Віцебск», дзе апісаны віцебскі перыяд жыцця мастака. Відавочна, што наступная павінна быць «Бэла Шагал і Віцебск». Апошні год гэтая постаць усё больш і больш прыцягвае маю ўвагу. Усе ведаюць, што першая жонка Шагала была музай, натхняльніцай. Але гэта толькі агульныя фразы. А хто такая Бэла? Што яна сабой уяўляла як чалавек? Прыйшоў час вывесці жонку мастака з цяню.

**Бэла Разенфельд** мела свае стасункі з гэтым горадам. Яна выйшла, у адрозненне ад Шагала, не з беднай сям'і. Яе бацька-ювелір быў адным з самых багатых людзей горада. Тым не менш родная сястра Бэлы была рэвалюцыянеркай і сядзела ў турме ў царскія часы. Брат Бэлы стаў аўтарытэтным эканамістам, выкладаў у ленінградскім універсітэце. Другі брат пераехаў у Францыю. Лінія французскіх Разенфельдаў, дарэчы, існуе і дагэтуль. Я з імі там пазнаёмілася.

**Знайшла дакументы** ў мінскім архіве, якія сведчаць пра гады вучобы Бэлы ў гімназіі. Там нават напісана, на якія пытанні яна адказвала падчас выпускных іспытаў. Потым яна вучылася на жаночых курсах у Маскве. І вось гэтая адукаваная дзяўчына, якая захаплялася тэатрам і спрабавала сябе ў ім, сустракае лахматага мастака, і атрымліваецца «партрэт жонкі мастака»...

**Кажуць,** што жанчына робіць мужчыну. А мне здаецца, гэта ўжо як мужчына захоча. Што датычыцца Шагала, то першай знакавай жанчынай у яго жыцці была Фейга-Іта, якая гандлявала селядцамі. У сваёй аўтабіяграфіі «Маё жыццё» мастак так піша пра сваю маці: «Я хачу сказаць, што дзесьці ў ёй таіўся мой талент і што я ўсё атрымаў у спадчыну ад яе, акрамя яе розуму». Гэта залежнасць ад прысутнасці жанчыны засталася ў мастака на ўсё жыццё.

**Тры жанчыны** — тры зусім розныя эпохі жыцця Шагала. Бэла — чалавек, які цалкам сябе перарабіў на патрэбы мужа, на яго імідж. Яна свядома адышла ў цень. Пасля смерці Бэлы Шагал 7 гадоў жыў грамадзянскім шлюбам з Вірджыніяй Мак-Ніл, якая не вытрымала выпрабавання і збегла ад прызнанага мастака з невядомым на фоне Шагала фатографам. Трэцяя жонка — Валянціна Бродская, жанчына з мёртвай хваткай. Яна рэгламентавала жыццё Шагала, сачыла, каб яго не турбавалі журналісты. Дарэчы, з-за гэтага, можа, ён і пражыў так доўга — ажно 98 гадоў.

**З творчай асобай** вельмі складана жыць ва ўсе часы. Прычым незалежна ад ступені вядомасці. Бо творчасць — гэта не толькі карціна, музычны ці літаратурны твор, гэта ў першую чаргу — праява свабоды. Таму ўсё залежыць ад жанчыны. Калі яе задавальняе поспех мужа, як Бэлу ці Валянціну, то яна будзе шчаслівай і знаходзячыся ў цені.

## Пра вышчарбленую цэглу, правінцыю і пральную машыну

**Мая папярэдніца** на гэтай пасадзе цяпер жыве ў Галандыі. Кожнаму сваё. Асабіста мне мілей за родны Віцебск няма месца ў свеце. Мне падабаецца тое, што горад маленькі, што не трэба траціць гадзіны, каб некуды даехаць. У Віцебску дастаткова цікавых імпрэз. І нават калі ёсць вялікае жаданне трапіць на канцэрт ці выставу ў Мінск, то гэта не праблема. 300 кіламетраў — не такая вялікая адлегласць. Ды і інтэрнэт сцёр межы, сёння ўсё роўна, дзе ты жывеш: у Мінску, у Парыжы ці ў Віцебску. Доступ да інфармацыі аднолькавы. Усё залежыць выключна ад твайго жадання. Правінцыя цяпер — гэта не месца жыхарства, гэта спосаб мыслення.



**Старая карта Віцебска** шагалаўскіх часоў вісіць у маім кабінеце невыпадкова. Праўда, гэта копія. У Віцебскім архіве знаходзіцца арыгінал. Мы вырашылі яе перавыдаць. Так і нарадзілася мая новая кніга. «Прагулкі са старой картай» — гэта адмысловы нарыс пра Віцебск. Мы вырашылі пачаць выдаваць серыю кніг, якая будзе называцца «Кніжная крама Дома Шагала». Гэта будуць кнігі не толькі пра Шагала ці Бэлу, але і кнігі пра Віцебск.

**Мне падабаецца** хадзіць з фотаапаратам па старым горадзе, па брукаванцы. Падабаецца шукаць нейкія новыя ракурсы, лавіць настрой горада. Прычым люблю гуляць не па самых прэзентабельных мясцінах, якія за апошнія гады дасканала адрэстаўравалі. А там, дзе засталіся сляды часу: іх можна знайсці і ў старым дрэве, і ў вышчарбленай цэгле.

**Калі ідзеш** па пешаходнай вуліцы Віцебска і бачыш, як людзі п'юць каву за столікамі летніх кавярняў, такое адчуванне, што ты ў Еўропе. Праўда, іншым разам лаўлю сябе на думцы, што ўсё ж гэта не той горад, у якім я вырасла. Вось тут кавярня, якой ніколі ў гэтым месцы не было. А гэты помнік устанавілі там, дзе ён не можа быць прынцыпова. Дрэнна, калі новыя будынкі выпіраюць, бяруць акцэнт на сябе. Важна, каб яны не засланялі помнікі гісторыі, якія побач. Але яны мусяць з'яўляцца, бо жыццё працягваецца.

**Усе ведаюць, што першая жонка Шагала была музай, натхняльніцай. Але гэта толькі агульныя фразы. А хто такая Бэла? Што яна сабой уяўляла як чалавек? Прыйшоў час вывесці жонку мастака з ценю.**

**Мы ўсталявалі** казырок над уваходам у музей Шагала. Яго, вядома, пры Шагалах не было. Але ж нам у першую чаргу трэба думаць пра бяспеку наведвальнікаў, каб ім на галаву ўзімку, не дай Бог, не зваліўся лядзяш. Мы таксама не можам дазволіць развальвацца цэгле. З аднаго боку, гэта прыкмета часу і прыгожа. Але па сутнасці — гэта сляды разбурэння. Як сказала адна наша добрая сяброўка, даследчыца Аляксандра Шацкіх: «Калі б Шагалы ўбачылі, як вы адрамантавалі іх дом, яны б не паверылі сваім вачам!»

**І на працы кнігі** пра Шагала, і дома. У мяне няма сям'і, і таму ў гэтым сэнсе прасцей. Інакш была б катастрофа. Бо працэс творчасці часта ўступае ў канфлікт з побытам. Самы пік маёй неарганізаванасці: калі пісала цудоўны тэкст пра Шагала, яго зносіны ў 1913 годзе з французскімі паэтамі-авангардыстамі Гіёмам Апалінэрам і Блэзам Сандрарам, і не прыкмеціла, як затапіла суседзяў. Фактычна я была дома, хадзіла там, але не бачыла, што ў мяне пральная машына вылівае ўсю ваду міма. Суседзі мяне, на жаль, не зразумелі, калі я сказала, што была ў 1913 годзе *(усміхаецца)*.

**Калі я саджуся пісаць,** мне неабходны цішыня і кнігі. Бо я не займаюся белетрыстыкай, не прыдумляю з галавы. Калі пішу пра Парыж 1913 года, я павінна дакладна ведаць, была на бульвары Распай у той час кавярня ці не. Увесь час даводзіцца ўдакладняць нейкія рэчы. У гісторыі дробязяў не бывае, таму шмат чытаю, у тым ліку і на замежных мовах. Калі б у мяне было больш часу, я б не раздумваючы патраціла яго на чытанне.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара і Уладзіміра БАЗАНА.**



■ Не хлебам адзіным

# ПАШТОЎКА — НА ПАМЯЦЬ, КНІГА — НА СНЯДАНАК!

## Польскі калекцыянер-беларус — аб сваім захапленні, недахопах электронных пасланняў і каштоўнасці сямейных альбомаў

**Для беларусаў, уладальнікаў гадавога шэнгену, паездкі ў Беласток на выхадныя сталі добрай завядзёнкай. І, пэўна, справа тут не толькі ў магчымасці сэканоміць на шопінгу, але і адчуць сябе... дома! А чаму б і не, зрэшты?! Нейкія паўсотні кіламетраў ад беларуска-польскай мяжы — і вось ён, горад, дзе нарадзіліся мастак Макс Вебер, вучоны Якаў Перэльман, філосаф Герман Фрыдман, стваральнік мовы эсперанта Людвіг Заменгоф (дарэчы, эсперантыстамі былі і беларускія пісьменнікі Сяргей Новік-Пяюн і Янка Маўр) ды іншыя выдатныя дзеячы культуры і навукі, горад, дзе незнаёмы мінак можа з вялікай верагоднасцю адказаць вам па-беларуску, бо менавіта тут жыве найбольшая колькасць беларусаў Польшчы, дзейнічае Беларускае грамадска-культурнае таварыства, працуе першы ў гэтай краіне Беларускі культурны цэнтр, выдаюцца кнігі і часопісы на беларускай мове, праходзяць Дні беларускай культуры, нашу мову вывучаюць у мясцовых школах і ў Беластоцкім універсітэце. Таму не дзіўна, што госць XXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі, віцэ-мэр Беластока, дарадца Прэзідэнта Польшчы па справах праваслаўнай грамады і беларускай меншасці Аляксандр СОСНА на просьбу распавесці чытачам «Звязды» «крыху пра сябе», выказаўся наступным чынам:**




— Калі мяне пытаюць, хто я такі, я заўжды адказваю: «Па нацыянальнасці я — беларус, сэрцам, як Шапэн, — паляк, душой яўрэй, а па духу — эсперантыст!» Бацькі мае па пашпарце — беларусы, і я, хаця і жыву ў Польшчы ўжо 51 год, не забываюся пра свае вытокі.

***— Ці не гэтае адчуванне прывяло вас у Мінск, на кніжную выстаўку?***

— У пэўным сэнсе, так. Бо я збіраю паштоўкі і фотаздымкі з выявамі праваслаўных храмаў Польшчы ў яе сучасных межах. Гадоў дзесяць таму лёс калекцыянера звёў мяне з Уладзімірам Ліхадзедавым: спачатку мы спрачаліся з ім за кожны рарытэт, а пасля вырашылі, што больш выгадна будзе супрацоўнічаць. Увогуле, у чалавека, які нешта збірае, звычайна шмат сяброў.

***— Мяняецеся паштоўкамі?***

— Часам бывае. Гэта ж такая рэч, якую не купіш у любой краме. Трэба вандраваць у сеціве, ездзіць па Еўропе. Таму дзеля цікавай знаходкі я падарожнічаю па Беларусі, Расіі, Украіне, Прыбалтыцы... Бацька мой часам кажа, што я ў гэтым сэнсе «юродзівы».

***— А захапленне ваша ці не ад бацькоў?***

— Усе людзі нешта збіраюць. Большасць — купюры банкаў Беларусі або Амерыкі *(усміхаецца)*, а іншыя калекцыянуюць маркі, канверты, пластыкавыя карткі, слонікаў на шчасце... Мае бацькі збіраюць усё! Яны стварылі музей «Бацькаўшчына», дзе можна пабачыць абсалютна ўсе прадметы побыту, каля дзвюх тысяч экспанатаў: як даўнія, так і сучасныя. Ад дзяржавы яны атрымалі пад гэта стары школьны будынак у вёсцы Рыбава. У ім шмат залаў, дзе абстаўлены і кухня, і сталовая, і дзіцячы пакой... Многія рэчы ім прынеслі людзі з навакольных вёсак. Напрыклад, кавамолка, якой ужо дваццаць гадоў, таксама там захоўваецца, бо і яна ўжо — гісторыя!

***— Але ж вы самі збіраеце паштоўкі толькі да 1945 года. Чаму не сучасныя, яны ж таксама праз нейкі час стануць гісторыяй?***

— Я збіраю і іх — у скрыначку! Аднак, па-першае, пасля вайны іх выдавалі значна менш. Тым больш на тэрыторыі Беларусі, Расіі... А па-другое, у сучасных паштовак... няма душы. Паглядзіце на старадаўнюю — колькі там можна пабачыць сэнсаў, як прыемна яе трымаць у руках! Гэта не сучасная — выдадзеная тысячнымі накладамі, халодная, як манета. Вось скажыце, калі вы напісалі апошні ліст ці адаслалі паштоўку?

***— Электронная лічыцца?***

— А як збіраць электронныя лісты ці SMS?! Сучасныя людзі, нарабіўшы лічбавых фотаздымкаў, нават не праглядаюць іх потым! А я думаю, што трэба абавязкова надрукаваць, падпісаць кожны. Таму падчас сустрэч з самымі рознымі людзьмі пастаянна звяртаюся да іх з заклікам: прыйшоўшы дахаты, не бяжыце ўключаць чарговы серыял, а сядзьце побач з вашай бабуляй ды распытайце яе добра пра асоб у вашым сямейным альбоме. І падпішыце абавязкова, бо праз 10-20-50 гадоў — ужо не ўспомніце, а праз 100 — ніхто не ўспомніць вас!..

***— Упэўнена, нехта зробіць і так, але гэтая праца застанецца на карысць толькі адной сям'і. А вось Уладзімір Ліхадзедаў выпусціў з тузін кніжак, дзе пабачыць яго паштоўкі могуць тысячы людзей!***

— За гэта яму вялізная ўдзячнасць! Бо ёсць розныя калекцыянеры. Адны збіраюць калекцыю, як скарб, і нікому не паказваюць. Я ж перакананы, што калекцыя павінна жыць, несці пэўную ідэю, а для гэтага яе павінны бачыць! Да прыкладу, у мяне ёсць сайт, куды кожны можа зайсці, я выдаў некалькі кніг, зрабіў адмысловыя выставачныя стэнды. Паштоўкі жывуць, пакуль іх бачаць!

***— У чым жа іх вартасць для нашага сучасніка, які, хутчэй, завітае ў інтэрнэт, чым на выстаўку?***

— Будучыня будуецца на грунце мінулага. Каб даведацца пра тое, што адбывалася даўней, можна зірнуць на паштоўку. Часам заўважаеш адно, часам — другое. А потым нараджаецца цікавасць: што гэта за храм, чые салдаты стаяць, як гэтая мясціна выглядае сёння... Любая паштоўка дае інфармацыю — варта толькі навучыцца чэрпаць з гэтай крыніцы.

***— Але ж лягчэй уключыць камп'ютарную гульню, чым пагартаць кнігу ці завітаць на выстаўку...***

— Так. Ды, ведаеце, кропля і камень разбурае. Я таксама пачынаў збіраць паштоўкі з адной, якая мне спадабалася. Магчыма, тыя, хто завітаў на выстаўку, таксама зацікавяцца калекцыянаваннем паштовак, але ім, безумоўна, будзе цяжэй, бо Ліхадзедаў практычна ўсё сабраў *(смяецца)*! І, наколькі я ведаю, спыняцца не збіраецца...

***— А паштоўкі з храмамі? Іх хопіць на ўсіх?***

— Насамрэч іх вельмі шмат, бо салдаты Першай сусветнай сярод іншага зрабілі адну добрую справу: каб паслаць вестку сваім бацькам, жонкам ці каханкам, яны часта фатаграфаваліся на фоне царквы (бо для іх яна была сімвалам пераможанага цара) і дасылалі здымак дамоў (пошта, дарэчы, была бясплатная). А там ужо адна друкарня за месяц друкавала дзевяць мільёнаў фотаздымкаў!.. І трэба зазначыць, атрымаўшы такі каштоўны падарунак, іх жанчыны цалавалі фота і клалі яго ў скрыначку або ў кнігу, не выкарыстоўвалі, як у нас, у якасці сурвэткі пад кубак ці месца для мух. Таму заходнюю паштоўку вымаеш — як з банка!

***— Старая паштоўка з выявай царквы ўжо сама па сабе ў пэўным сэнсе носьбіт духоўнасці. А якой, на вашу думку, мусіць быць сучасная кніга, каб яна несла штосьці большае за інфармацыю?***

— Цяжка адказаць... Я, напрыклад, не чытаю фантастыкі. Мяне больш цікавяць гістарычныя раманы, біяграфіі. Я мяркую, што кніга павінна вучыць! Няхай гэта не будзе адразу дзясяты клас — хай першы: простае і зразумелае выданне, з прыгожымі ілюстрацыямі. Калі ў мяне з'явіўся ўнук, я канчаткова зразумеў, што ўсе мы павінны пакінуць на зямлі нешта пасля сябе. Не трэба ляцець у космас, будаваць сотні хмарачосаў, каб даказаць некаму, што мы на гэта здольныя. Таксама і з кнігамі: навошта ўсе гэтыя занадта дарагія выданні? Кніга мусіць быць такой, каб яе можна было чытаць за сняданкам!

***— Значыць, электронная кніга не для вас?***

— Не. Кнігу трэба адчуваць: і пальцамі, і душой!

**Гутарыла Таццяна СІВЕЦ**

■

# Прайду я па Чыгуначнай, звярну на Піянерскую...

**Супрацоўнікі кампаніі «Яндэкс» падлічылі, колькі вуліц у беларускіх гарадах. У тройку лідараў па іх колькасці, паводле звестак сэрвісу «ЯндэксКарты», увайшлі Мінск, Магілёў і Віцебск. У сталіцы налічваецца каля 1300 вуліц, праспектаў, плошчаў, тупікоў і завулкаў, у Магілёве іх каля 900, у Віцебску — 850. Самым кампактным з абласных цэнтраў стаў Гродна — у горадзе 550 вуліц.**

Не абышлі ўвагай спецыялісты і назвы. Самымі распаўсюджанымі (44%) аказаліся тапонімы, звязаныя з геаграфіяй, асаблівасцямі прыроды альбо іншымі адметнасцямі самой вуліцы: Чыгуначная, Заходняя, Цяністая, Шырокая і г.д. Пятая частка (22%) распаўсюджаных назваў звязана з савецкім мінулым і дзеячамі рэвалюцыі: вуліцы Леніна, Карла Маркса, Савецкая, Піянерская, Інтэрнацыянальная і іншыя. На трэцім месцы па папулярнасці — імёны і прозвішчы герояў, славутых палкаводцаў, лётчыкаў: Чкалава, Гастэлы, Суворава, Будзённага; крыху менш распаўсюджаны вуліцы, названыя ў гонар вядомых навукоўцаў, пісьменнікаў і іншых дзеячаў мастацтва: Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Пушкіна, Рэпіна.

— Мы пастараліся не проста скласці рэйтынг, а распавесці пра вуліцы буйных гарадоў штосьці раней не вядомае, — адзначае прадстаўнік прэс-службы кампаніі «Яндэкс» Уладзімір Ісаеў. — Напрыклад, ці ведалі вы, што ў Віцебску, дзе ёсць шмат кварталаў прыватнай забудовы, ёсць ажно 17 Лучоскіх, 17 Гарадоцкіх і 15 Полацкіх вуліц?

Больш за дзве тысячы, альбо каля паловы ад агульнай колькасці, вуліц у буйных беларускіх гарадах маюць унікальныя назвы, якія не сустракаюцца ў іншых абласных цэнтрах. У гэтым спісе лідзіруе таксама Мінск (57% унікальных назваў), а замыкаюць яго Брэст і Гомель (41%). У Магілёве, напрыклад, можна прагуляцца па «музычных» вуліцах Шуберта, Шапена, Моцарта і Бетховена, у кварталах прыватнай забудовы Брэста ёсць вуліцы Вольная, Добрая і Звонкая, а ў Гродне прыезджых парадуюць вуліцы Ветлівая, Сяброўская, Шчодрая і нават Экзатычная.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПЕРАРВАЛІ ПСІХАТРОПНЫ «БІЗНЕС»

**У сталіцы праваахоўнікі затрымалі збытчыка асабліва небяспечнага псіхатропу.**

— На працягу некалькіх апошніх месяцаў дылер да дробязяў распрацаваў і ўкараніў на практыцы схему продажу наркотыку. Кліенты ведалі, што ў яго заўсёды можна купіць патрэбны ім тавар, але ніхто не ведаў у твар самога прадаўца, — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС сталіцы Ганна Чыж-Літаш. — У прыватнасці, схема заключалася ў тым, што мужчына не сустракаўся з кліентамі асабіста. Усе разлікі адбываліся выключна праз электронны кашалёк, а пакупнік атрымліваў тавар з тайніка.

Пры затрыманні 33-гадовага мінчаніна ў яго быў знойдзены гатовы да продажу шпрыц з псіхатропам. Паводле слоў грамадзяніна, даход ён меў неблагі: адзін грам небяспечнага рэчыва каштуе на «чорным рынку» 110 долараў. Дарэчы, затрыманы зусім нядаўна вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, дзе адбываў пакаранне за збыт метадону. А пасля вызвалення вырашыў перайсці на гандаль асабліва небяспечным псіхатропам. Да слова, у месцах пазбаўлення волі мужчына пабываў не толькі за збыт наркатычных рэчываў, але і за крадзяжы — усяго ён адбываў пакаранне чатыры разы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# І ЛЯЦЕЛІ ЯНЫ «ПАД АДХОН»



Карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі — з Сочы

**Сёння, у сераду, у беларускіх алімпійцаў выхадны. Яны не ўдзельнічаюць у розыгрышы ніводнага з шасці камплектаў узнагарод. А ўчора ўвечары завяршылася жаночая гонка праследавання. Калі вы будзеце чытаць гэтыя радкі, то ўжо будзе вядомы вынік. Нагадаю, што ўся наша чацвёрка (Домрачава, Скардзіна, Дубарэзава і Калінчык) — удзельніцы гэтага захапляльнага спаборніцтва. І штосьці падказвае: медалю быць. Гэта адчувалася па настроі нашых дзяўчат пасля папярэдняй гонкі — спрынта. Яна іх раззлавала — усіх, чацвярых...**

Чаго не скажаш, на жаль, пра мужчынскую чацвёрку. Па выніках сваёй гонкі праследавання ў панядзелак усе яны адкаціліся ўніз — і па хуткасці на трасе, і па выніковасці ў стральбе. А Сяргей Новікаў і Уладзімір Чапелін наогул не змаглі ўтрымацца на нагах. Праўда, не толькі яны.

Што адбывалася на трасе і вакол яе, лепш за ўсіх ведае старшы **трэнер нашай біятлоннай зборнай Алег РЫЖАНКОЎ.**

— Думаю, што няўдалае выступленне (41-е месца Чапеліна ці 50-е Новікава ўдалым жа не назавеш) звязана з работай лыжаў. У папярэдняй гонцы яны сябе паказалі няблага. Сёння з лыжамі была праблема. Чапелін нядрэнна адстраляўся, дапусціўшы толькі адзін промах на 20 мішэнях. А вось на дыстанцыі яго пастаянна абганялі канкурэнты — як на спусках, так і на пад'ёмах. Не хацелася б прад'яўляць прэтэнзіі сэрвісменам, што займаліся змазкай, бо змяніліся ўмовы надвор'я, якія: пайшоў невялікі дождж, і снег стаў «цяжкім». Усе выконвалі сваю работу, нешта не атрымалася.

***— Чаму спартсмены так дружна падалі на трасе, напярэдадні ж усё было нармальна?***

— Сапраўды, падалі многія, не толькі нашы. У некаторых нават ламаліся лыжы, а іншыя вылятáлі з трасы «пад адхон», так бы мовіць. Радыус аднаго з паваротаў перад спаборніцтвамі быў павялічаны, а сама траса ў тым месцы — звужана. Гэта наклала свой адбітак, не ўсе былі гатовы да такіх змен. На трэніроўках жа было па-іншаму. Акрамя таго, пад снегам утварыўся лёд. Вось такія прычыны, іншых не бачу.

***— Якія далейшыя шанцы мужчынскай каманды?***

— Нас чакае індывідуальная гонка на 20 кіламетраў. Марыць пра медалі не прыходзіцца, гаворка можа ісці пра годны вынік. Які? Увайсці ў лік 30-40 наймацнейшых. Гэта магчыма пры некалькіх складніках. І сярод іх галоўны — удалая падрыхтоўка і змазка лыжаў, а таксама — граматны ход на трасе (каб не дапусціць падзенняў) і прыцэльная стральба на рубяжах.

...Гэта ўсё планы. «Эх, Беларусь, Беларусь... Не шанцуе вам, як і нам», — уздыхаў, стоячы ў чарзе ў буфет, адзін з расійскіх балельшчыкаў. Трохколерная тарсіда, як і чырвона-зялёная, згарнуўшы сцягі, моўчкі рухалася да «канаткі» — дарогі, якая спусціць іх з амаль паўтаракіламетровай вышыні ў шматколерную ад ілюмінацыі даліну, дзе іх чакалі кавярні, рэстараны ці простая вячэра ў сціплым нумары атэля.



Расійскія спартсмены дэманструюць свой «сняданак для чэмпіёнаў».

ДАРЭЧЫ

## Што па чым?

Сочы — горад курортны, а ў такіх месцах, як вядома, цэны крыху вышэй. Многім заўзятарам, што прыбылі і працягваюць прыбываць у сталіцу цяперашняй Алімпіяды (а сярод іх вельмі шмат і нашых землякоў), можа здасца, што на час Алімпійскіх гульняў схадзіць у сталовую, кавярню — паабедаць ці павячэраць — будзе вельмі дорага. Давайце высветлім, ці так гэта.

Вось, напрыклад, Адлер, Алімпійскі парк — тэрыторыя, дзе размешчаны спартыўныя дэлегацыі і аб'екты па масавых відах праграмы Гульняў — па хакеі, фігурным катанні, канькабежным спорце. Тут заўсёды шмат балельшчыкаў з розных краін — ад Аўстраліі да Аргенціны і Канады. Ва ўсю працуе выязны гандаль, так званыя казачыя падворкі. Казаць пра казачую гасціннасць — справа няўдзячная. Цэны тут — самага шырокага дыяпазону. Але ў цэлым гасціннасць па-казацку прымальная для ўсіх. Звычайны бутэрброд з ялавічынай — 50 рублёў, а ў меню няма нічога даражэйшага за 200 рублёў (каб было прасцей лічыць, 1 расійскі рубель = 280 беларускіх). Вось думка чалавека, які тут усё ведае. **Таццяна, былая мінчанка.** У 1993 годзе з сям'ёй эмігрыравала ў ЗША. На радзіме з таго часу не была. Жыве і працуе ў Брукліне (Нью-Ёрк) у банку. На час водпуску вырашыла папрацаваць у Сочы... звычайным валанцёрам:

— Як і на любы курорт, людзі едуць сюды траціць грошы. Але паесці тут можна сапраўды нядорага. Не скажу, што танна, але не завоблачна...

Амерыканцы, шведы, немцы, палякі. «Баршчэўні» казакоў прываблíваюць усіх — расійскім каларытам, традыцыямі кубанскага народа. Усё гэта карыстаецца вялікай папулярнасцю. Смажаны карп, лешч, юшка; кулеш, зноў жа з рыбай; галубцы і халадзец, вішнёвы морс, кавуновы мёд, гарэлка ўрэшце... Тут усё, чым жыве і харчуецца мясцовая вёска.

— Вы ведаеце, нават да слёз прабіраюць тыя цёплыя водгукі, якія мы атрымліваем кожны дзень ад гасцей. Гэта вельмі кранальна, — гаворыць яшчэ адна **Таццяна — начальнік упраўлення гандлю Беларэчанскага раёна.**

А вось, што думае **Жан, балельшчык-турыст з Канады:**

— Я чакаў, што цэны тут будуць значна вышэйшымі. Мы ў сябе ўвесь час чуем, што Расія — нябедная краіна. Але насамрэч цэны для адпачынку тут нармальныя, я не назваў бы іх высокімі.

Абед з капусты, бліноў, булачкі з гарбатай абыдзецца прыблізна ў 400 рублёў ($13). І такіх устаноў харчавання тут дастаткова.

Ёсць і іншыя. Звычайная сталовая. Відаць, студэнцкая. Ці проста класічная. Калі ўзгадаць савецкія часы. Капуста, рыс, катлета, кампот, булачка. Такі просты абед абыдзецца ўсяго ў 170 рублёў. Для любога кашалька страта зусім не істотная. Праўда, без мясцовага каларыту — ніхто тут не будзе забаўляць вас. Аднак менавіта такія сталовыя прываблíваюць бюджэтных турыстаў сваімі нізкімі цэнамі. Прычым заходзяць сюды ўсе: і рускія балельшчыкі, і прыезджыя з блізкіх і далёкіх краін, якія знойдуць, на што патраціць сэканомленыя грошы.

Ну а самы танны спосаб — гатаваць самому, калі ёсць такая магчымасць. Магазіны тут розныя, як і цэны ў іх. Хлеб — 16-19 рублёў, літр малака — 28, кефір — 30, масла — 25-40, яйкі — 25 (за дзясятак), кілаграм бульбы — 25-35, пачак макароны — 34-41, бутэлька гарэлкі — 120- 260, літр соку — 28-60.

Расійскія турысты ў адзін голас пераконваюць, што Масква ці Санкт-Пецярбург нашмат даражэйшыя гарады.

Ёсць, вядома, дарагія месцы і тут, за сціплую вячэру можна пакінуць 2-3,5 тысячы рублёў. Вось, напрыклад, адно з папулярных у гараджан месцаў — кавярня «Стары базар» у гістарычнай частцы Сочы. Выразка з ялавічыны з грыбамі і смятанай — 330 рублёў, выразка свіная смажаная — 280, камбала чарнаморская смажаная — 520, салата «Цэзар» з курыцай — 240, салата з сёмгі і морапрадуктаў — 425 і толькі славутае «Аліўе» — 130, столькі ж квашаная капуста з маслякамі. Юшка з сёмгі — 170, салянка зборная мясная — 185, салянка па-грузінску — 230, хашлама з бараніны — 250. Булачка — 28. Бутэлька мінералкі — 48, кока-кола — 80...

Як бачым, усё залежыць ад таўшчыні кашалька, дакладней — ад якасці змесціва ў ім. Пры ўсім пры гэтым можна сцвярджаць адно: ад галоднай смерці ў горадзе Сочы і ваколіцах яго ніхто не памрэ.

## ■ Zамор'е

### За вас вырашыць... кашалёк

**Інжынеры з Японіі стварылі кашалёк, які можа здзейсніць рэвалюцыю ў сферы эканоміі асабістых сродкаў. Распрацоўшчыкі назвалі гаджэт «Living wallet», што азначае «жывы партаманет».**





Па словах распрацоўшчыкаў незвычайнага кашалька, яго можа сінхранізаваць з планавальнікам бюджэту ў мабільнай прыкладной праграме ўладальніка. Збіраючы інфармацыю аб пакупніцкіх паводзінах, гаджэт праводзіць яе аналіз і прымае рашэнне, варта гаспадару рабіць пакупку ці лепш устрымацца.

Калі сродкі на рахунку пакупніка заканчваюцца, прылада запускае ахоўныя механізмы. Гаджэт спачатку робіць спробу ўцячы ад свайго ўладальніка (для гэтага ў яго ёсць маленькія колы), а калі ў гаспадара атрымаецца злавіць кашалёк, прылада пачынае «крычаць». Калі і гэта не спыніць уладальніка партаманета, ён пачынае рассылаць SMS-паведамленні з просьбай аб дапамозе маці ці яшчэ камусьці, чый нумар быў пазначаны пры наладцы. У выпадку, калі сродкаў на рахунку ўладальніка дастаткова, кашалёк становіцца «хадзячым дарадцам», які дае свайму ўладальніку рэкамендацыі наконт самых разнастайных тавараў у інтэрнэт-краме. Пакуль не паведамляецца, паступіў «жывы» партаманет у продаж ці не.

Варта нагадаць, што высокатэхналагічныя кашалькі раней былі распрацаваны ў Масачусецкім тэхналагічным інстытуце ў ЗША. Праўда, яны былі не смешнымі, а хутчэй жудаснымі.

### Я не сплю, не сплю, не сплю...

**Кітайскія студэнты вынайшлі цікавы (а некаторыя лічаць, што нават геніяльны) спосаб рыхтавацца да іспытаў па начах і не засынаць. Яны з дапамогай прышчэпак прывязваюць валасы да столі або вешалак. Кожны раз, калі студэнт пачынае вадзіць носам, прышчэпкі ўтрымліваюць валасы, і рэзкі рывок за іх не дае заснуць.**

Метад стаў папулярным пасля таго, як дзве студэнткі з Універсітэта сельскай і лясной гаспадаркі правінцыі Фуцзянь сфатаграфаваліся ў такім выглядзе і выклалі фота ў інтэрнэт. 20-гадовай Чэнь Тан і яе суседцы па пакоі 21-гадовай Хуань Лю давялося тады спраўляцца з велізарным аб'ёмам матэрыялу, і спаць ім папросту было не было калі, а хацелася.

Яны спрабавалі адагнаць сон звычайнымі метадамі — кафеінам, адцісканнямі і паніжэннем тэмпературы з дапамогай кандыцыянера, але нічога не дапамагала. І тады студэнткі вырашылі пашукаць рашэнне ў падручніках па гісторыі. Яны прачыталі пра двух вядомых кітайскіх навукоўцаў, якія практыкавалі крайнія метады, каб захаваць яснасць розуму: калолі сябе іголкамі кожны раз, калі пачыналі засынаць, або прывязвалі валасы да столі. Чэнь вырашыла, што другі метад можа быць эфектыўным, і вырашыла паспрабаваць.



Пасля таго, як яе першы фотаздымак з прывязанымі да прышчэпак валасамі з'явіўся ў сеціве, спосаб, здаецца, стаў вірусным: з кожным днём з'яўляецца ўсё больш і больш такіх фота. Некаторыя студэнты гэтак жа, як Чэнь, выкарыстоўваюць прышчэпкі, іншыя — шалікі.

### У золата можна адзецца



**А зрабіць гэта можна ў Індыі — менавіта там стварылі кашулю з чыстага золата. Да твору мастацтва прыкладаюцца таксама залатыя абшэўкі, кольцы і папружка. Кашуля ўпрыгожана шасцю гузікамі з буйнымі крышталямі Swarovski.**

Індыйскі бізнесмен Дата Фудж уразіў прыхільнікаў эксклюзіўнага адзення і заказаў мужчынскую кашулю з чыстага золата. Майстар ствараў свой шэдэўр на працягу двух тыдняў, працуючы па 16 гадзін на суткі. Усяго на кашулю пайшло тры кілаграмы жоўтага золата. Кашуля выканана з залатых пласцін, старанна злучаных паміж сабой. У працы выкарыстоўвалася адмысловая тэхналогія, якая робіць выраб па-сапраўднаму люксавым, але сакрэт яе майстар не раскрыў. Вядома, што залатыя пласціны кашулі мацуюцца да асновы з белага вельвету, каб не падрапаць скуру ўладальніка гэтага цуду моды. Кошт кашулі — $22,5 тысячы, і яна лічыцца самай дарагой у свеце.

### Хочаце сыру за... 1200 долараў?

**Вырабам самага дарагога сыру ў свеце займаюцца на аслінай ферме ў Засавіка, адным з самых вядомых запаведнікаў Сербіі. Сыр Пуле зроблены з малака асліц і каштуе 1200 долараў за кілаграм.**

Адзін з працаўнікоў фермы расказаў, што для вытворчасці аднаго кілаграма самага дарагога сыру трэба 25 літраў свежага малака асліц. Белы, рассыпісты сыр вонкава падобны да іспанскага сыру манчэга, але з больш глыбокім, багатым смакам. Манчэга прадаецца ў еўрапейскіх супермаркетах па параўнальна нізкай цане 20 долараў за кілаграм і з'яўляецца, вядома, больш сціплым варыянтам. У запаведніку таксама вырабляюць малако асліц у бутэльках, якое, як лічыцца, было адной з таямніц прыгажосці Клеапатры. Легендарная егіпецкая царыца штодня прымала ванну з гэтага малака. Іншымі дарагімі сырамі лічацца сыр з малака шведскіх ласіх, які каштуе каля 950 долараў за кілаграм, і Caciocavallo Podolico — сыр, выраблены з малака рэдкай італьянскай пароды каровы, якая дае малако толькі ў маі і чэрвені.





**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

## ■ На сувязі

### Мабільны аператар склаў карту турыстычных маршрутаў

**Па звестках мабільнага аператара МТС, за 2013 год у іх сетцы зарэгістраваліся 4,2 мільёна гасцей (у 2012 годзе — 3,5 мільёна).**

Больш за ўсё гасцей, якія карысталіся паслугамі роўмінгу, было з Расіі, Германіі, Нідэрландаў, Італіі, Украіны, Польшчы, Вялікабрытаніі, Чэхіі, Турцыі і Іспаніі. Калі казаць аб экзатычных краінах, то пазнаёміцца з Беларуссю прыязджалі вандроўнікі з Барбадоса, Мадагаскара, Новай Зеландыі, Папуа Новай Гвінеі, Сенегала, Сейшэльскіх і Фарэрскіх астравоў.

Як сведчыць статыстыка, асноўным спосабам зносін замежных абанентаў застаюцца галасавыя выклікі. Агульная працягласць іх размоў на тэрыторыі Беларусі за апошні год павялічылася на 18%, у той час як спажыванне інтэрнэт-трафіку вырасла на 47%.

У кампаніі МТС падлічылі, што навагоднія канікулы ў Беларусі правялі амаль 540 тысяч іншаземцаў (на 30% больш, чым летась), з іх 340 тысяч расіян, 85 тысяч украінцаў і 37 тысяч гасцей з Літвы. Новы год сустракалі ў Беларусі таксама турысты з Алжыра, Конга, Калумбіі, Кеніі, Чылі і Мальдыўскіх астравоў.

Калі абапірацца на інфармацыю па роўмінгу, то ў беларусаў самымі папулярнымі летась краінамі для вандровак былі Расія, Украіна, Польшча, Літва, Германія, Турцыя, Балгарыя, Італія, Егіпет, Іспанія і Аўстрыя. Прычым толькі ў летнія месяцы за мяжу выязджалі 230 тысяч абанентаў МТС, якія заставаліся з радзімай «на сувязі». А, напрыклад, чэмпіянат свету па хакеі, які праходзіў у Швецыі і Фінляндыі, наведалі крыху больш за тысячу балельшчыкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## На тым краі грымотнага стагоддзя




Нядаўна пабываў на выстаўцы дакументаў Першай сусветнай вайны. Уразіла, што пісьмы з фронту, фотаздымкі, рэчы з акопаў праз стагадовую адлегласць успрымаюцца вельмі зразумелымі: падобныя да сучасных думкі у лістах, падобныя выразы вачэй на партрэтах... Гора вайны робіць падобнымі людзей з розных эпох. Ваенныя папялішчы не астываюць.

*На тым краі грымотнага стагоддзя*
*Мае дзяды ўглядаюцца у далеч.*
*У высі зоркі ў тым жа карагодзе,*
*І тыя ж плёсы лашчыць хваляй Нарач,*

*І той жа самы вецер цешыць сосны,*
*Спявае ды чытае зоркам вершы...*
*Усё тое ж, ды... зусім другія лёсы*
*Адзначаны стагоддзем дваццаць першым.*

*На тым краі стагоддзя б'юць гарматы*
*І навакол нікому невядома,*
*Ці дабярэцца пошта да салдата?*
*Ці дачакае маці паштальёна?*

*Старыя здымкі у руках трымаю...*
*Яны агнём пякуць і неруш рушаць —*
*Пажар вайны гарыць — не дагарае,*
*І рэчка часу полымя не тушыць.*







НАРОДЖАНЫЯ 12 лютага

**Яны не прымаюць рознагалосся і таму валодаюць здольнасцю аб'ядноўваць вакол сябе супрацьлегласці. Аднак, нават прыміраючы сяброў, яны не забываюць пра свой інтарэс і не будуць удзельнічаць у тым, што не прыносіць асабістай выгады. Яны не здольны несці цяжар асабістых праблем, ім цяжка наладжваць стасункі з сябрамі і партнёрамі, таму што яны ігнаруюць погляды іншых. Гэтыя людзі шматбакова развітыя і таленавітыя, што дапамагае ім рухацца па службовай лесвіцы і настойліва ісці да вызначанай мэты.**

Даты Падзеі Людзі



**1809** год — нарадзіўся Чарльз Дарвін, англійскі натураліст і падарожнік, аўтар эвалюцыйнай тэорыі развіцця жывых арганізмаў (дарвінізму). Большасць навукоўцаў яшчэ пры жыцці Дарвіна прызналі яго тэорыю эвалюцыі, і сёння яна з'яўляецца падмуркам для сучаснай тэорыі эвалюцыі. Сам Дарвін пра сваё жыццё казаў так: «Я вучыўся, потым здзейсніў кругасветнае падарожжа, а потым зноў вучыўся: вось мая біяграфія».

**1908** год — у Нью-Ёрку на плошчы Таймс-сквер быў дадзены старт першым аўтагонкам вакол зямнога шара. Шэсць аўтамабіляў даехалі спачатку да Сан-Францыска, потым морам пераправіліся ў Японію, адкуль зноў жа морам прыбылі ў Расію. Траса гонкі пралягала па Сібіры, затым праз усю Еўропу. Пераможца Джордж Шустэр фінішаваў у Парыжы 26 ліпеня, правёўшы за рулём 88 дзён.

**1914** год — нарадзіўся (Данецкая вобл., Украіна) Бакланаў Міхаіл Іванавіч, заслужаны архітэктар Беларусі (1969). Асноўныя працы ў Мінску: будынак Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, жылыя дамы па вул. К.Маркса, на рагу вуліц Захарава і Першамайскай, будынак Беларускага медыцынскага ўніверсітэта, галоўны корпус турыстычнай базы і комплекс дома адпачынку «Сосны» на возеры Нарач у Мядзельскім раёне.

Было сказана

**Джон ГАЛСУОРСІ, англійскі празаік і драматург:**

*Адзінота — гэта яшчэ не самае страшнае падчас выпрабаванняў; самае страшнае — сядзець склаўшы рукі.*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 8.36 | 18.12 | 9.36 |
| Віцебск | 8.29 | 17.59 | 9.30 |
| Магілёў | 8.26 | 18.02 | 9.36 |
| Гомель | 8.18 | 18.03 | 9.45 |
| Гродна | 8.50 | 18.28 | 9.38 |
| Брэст | 8.47 | 18.33 | 9.46 |

**Месяц**

*Поўня 15 лютага.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

*Пр. Васіля, Івана, Іпаліта, Пятра, Рыгора, Сцяпана.*
*К. Аляксея, Дзям'яна, Людвіка, Мадэста.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Ну, падумайце самі, як я магу хадзіць з 18 да 20 гадзін у трэнажорную залу зніжаць вагу, калі ў гэты час у мяне вячэра?!..**

— Дарагая, хочаш, я падару табе Месяц, Сонца і ўсе зоркі?!

— Дарагі, а што — грошай зусім няма?!

**Я люблю тры рэчы: жанчын, гарэлку, і калі яны разам.**

— Люся, дзе ты была ўчора так позна?

— Па раёне гуляла.

— Ён жа не вельмі добры і нават небяспечны!

— Яшчэ які добры! Глядзі — два айфоны і залаты ланцужок!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.925. Індэкс 63850. Зак. № 656.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 лютага 2014 года.